КУЛЬТУРА
WWW.KIMPRESS.BY
ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА
1991 г. / № 8 (1499)
20 лютага 2021 г.

Вяртанне “Паўлінкі”

Фота з сайта president.gov.by

Кожны новы сезон Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы падае гледачам сваю візітную картку — дэманструе спектакль “Паўлінка” Янкі Купалы. Напрыканцы тыдня ў Купалаўскім адбылася рэпетыцыя знакамітага спектакля ў абноўленым акцёрскім складзе, на якой прысутнічаў Прэзідэнт краіны. Міністр культуры Анатолій Маркевіч расказаў кіраўніку дзяржавы аб стане спраў ва ўстанове і адраджэнні класічнага спектакля “Паўлінка”.

“Значыць, у 2020 годзе мы загубілі гэты спектакль і зноў яго аднавілі? — удакладніў Аляксандр Лукашэнка. — Цалкам? Не горш, чым было?”

“Я думаю, нават лепш”, — адказаў міністр. Ён распавёў, што ў абноўленым спектаклі іграюць не толькі сталыя акцёры Купалаўскага з ранейшай трупы, але і моладзь — студэнты БДУКіМ і БДАМ. Па словах Анатолія Маркевіча, яны добра ўліліся ў калектыў: “Бачу ззяючыя вочы нашай моладзі. Яны лічаць за гонар служыць тут, у нашым тэатры, і быць побач з мэтрамі сцэны Купалаўскага. І я хачу запэўніць: гэтыя хлопцы не падвядуць ні тэатр, ні краіну”.

Аляксандр Лукашэнка таксама пагутарыў з акцёрамі і запэўніў іх, што Купалаўскі быў і застанецца нацыянальным здабыткам, а яго праца будзе абавязкова адноўлена.

Сцэна са спектакля.

Фота Максіма ГУЧАКА, БЕЛТА

Суботнія сустрэчы

СКАРБЫ МАТЧЫНАЙ МОВЫ

21 лютага ва ўсім свеце адзначаецца Міжнародны дзень роднай мовы. З гэтай нагоды “К” пагутарыла з прадстаўніком Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Вольгай Міцкевіч.

ст. 6

Форум

“КНІГА АБ’ЯДНОЎВАЕ ЛЮДЗЕЙ І КРАІНЫ”

Пад такім дэвізам працуе XXVIII Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш, на якой дэманстравалі свае дасягненні ў кнігавыдавецкай дзейнасці шмат краін свету і, безумоўна, Беларусь.

ст. 7

Погляд з XXI стагоддзя

“РАНЕЙ ТУТ УСТАВАЛА ЗЯМЛЯ НА ДЫБКІ...”

18 лютага споўнілася б 99 гадоў з дня нараджэння народнага мастака БССР і СССР Міхаіла Савіцкага. Як 19-гадовы хлопец з Беларусі, у будучым — сусветнавядомы мастак, стаў удзельнікам гераічнай Севастопальскай эпапеі, — пра ўсё гэта распавядае “К” на сваіх старонках.

ст. 15

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ.

З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

18 лютага ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны адбылася выніковая калегія Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь “Аб выніках дзейнасці арганізацый у сферы культуры ў 2020 годзе і задачы на 2021 год”.
У мерапрыемстве прынялі ўдзел прадстаўнікі вышэйшых і мясцовых органаў улады, кіраўнікі навучальных устаноў, дзеячы культуры.
Адбылася грунтоўная змястоўная размова, дыялог неабыякавых людзей, суразмоўцаў, паплечнікаў.
Па завяршэнні работы калегіі дзеячам культуры былі ўручаны ўзнагароды ўрада і Міністэрства культуры.

Анатолій МАРКЕВІЧ,
міністр культуры Рэспублікі Беларусь:

“Культура дапамагае нам адчуваць сябе адзіным і самабытным народам”

(З даклада)

Сёння мы падводзім вынікі развіцця сферы культуры ў няпростым для ўсёй краіны 2020 годзе, аналізуем яго наступствы, шукаем шляхі вырашэння існуючых праблем і з улікам гэтага ставім задачы на 2021 год.

Беларуская культура — неад’емная частка дзяржаўнага суверэнітэту. Яна дапамагае нам адчуваць сябе адзіным і самабытным народам. Бо ў сучасным свеце культура з’яўляецца падмуркам патрыятызму, умацавання незалежнасці, яднання нацыі, асноваўтваральным элементам дзяржаўнасці.

ЭКАНОМІКА

Дзяржаўная палітыка ў сферы культуры захоўвае сваю сацыяльную накіраванасць. На працягу ўжо шэрагу гадоў перавыконваецца ўсталяваны дзяржаўны сацыяльны стандарт у частцы расходаў на культуру ў разліку на аднаго жыхара (у 2020 годзе расходы склалі 2 базавыя велічыні пры нарматыве 1,3). Атрымана каля 5 мільёнаў рублёў спонсарскай дапамогі.

У адпаведнасці з Праграмай дзейнасці Урада Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2025 года з мэтай забеспячэння стабільнага росту даходаў насельніцтва як асновы яго шчаснага і якаснага жыцця пастаўлена задача павысіць памер аплаты працы ў бюджэтнай сферы ў цэлым і апераджальнымі тэмпамі работнікаў сферы культуры — да 80%

У гэтай сувязі ў 2021 годзе важнымі задачамі па-ранейшаму будуць заставацца нарошчванне пазабюджэтных даходаў з ростам не менш, чым на 7,5% у параўнанні з 2020 годам, павелічэнне не менш чым на 9 % аб’ёму пазабюджэтных (уласных) даходаў, што накіроўваюцца на выплату заробнай платы работнікам арганізацый культуры. Не менш важнай задачай застаецца павелічэнне аб’ёму экспарту паслуг арганізацыямі, падпарадкаванымі Міністэрству культуры, не менш чым на 2% у адносінах да 2020 года.

ПРАВАВОЕ РЭГУЛЯВАННЕ Ў СФЕРЫ КУЛЬТУРЫ

Аналіз практыкі прымянення Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры, а таксама сітуацыі, звязанай з ажыццяўленнем культурнай дзейнасці па розных напрамках, выявіў неабходнасць удасканалення прававога рэгулявання асобных грамадскіх дачыненняў у сферы культуры.

У бліжэйшы час павінна быць завершана работа па ўзгадненні змяненняў у Кодэкс аб культуры, якія закрануць пытанні аховы гісторыка-культурнай спадчыны, арганізацыі і правядзення культурных мерапрыемстваў, перамяшчэння культурных каштоўнасцяў, дзейнасці творчых саюзаў, класіфікацыі фільмаў, развіцця інфармацыйных тэхналогій у сферы бібліятэчнай справы, часовых экспазіцый у сферы музейнай справы.

КАДРАВАЯ ПАЛІТЫКА

Застаецца актуальным пытанне прыцягнення і замацавання маладых спецыялістаў. Асноўная ўзроставая катэгорыя ў сферы культуры — работнікі сярэдняга ўзросту ад 32 да 49 гадоў — 38%. Разам з тым доля працаўнікоў пенсійнага ўзросту даволі істотная — 12%.

Неабходна вывесці працу з рэзервам кадраў на сістэмную і планамерную аснову.

У кандыдата для ўключэння ў рэзерв павінны быць сфармаваныя каштоўнаснае стаўленне да дзяржавы і грамадства, пачуццё патрыятызму, нацыянальная самасвядомасць, прававая і інфармацыйная культура.

Асноўнымі задачамі на 2021 год таксама павінны зрабіцца аператыўнае запаўненне вакансій кваліфікаванымі кадрамі, стварэнне спрыяльных умоў для іх працы і кар’ернага прасоўвання, выкарыстанне новых форм і метадаў работы з кіруючымі кадрамі і рэзервам, у тым ліку на аснове вывучэння і абагульнення перадавога вопыту такой працы ў рэгіёнах.

Заканчэнне — **на старонках 4 — 5**

КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА) Выдаецца з кастрычніка 1991 года.

Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Галоўны рэдактар — КРЫВАНОС Аляксандр Паўлавіч; **намеснік галоўнага рэдактара** — Юрый КАРПЕНКА; **адказны сакратар** — Таццяна ПАШЭНЬКА; **рэдактар аддзела:** Яўген РАГІН; **агляднымі рэдакцыі:** Зміцер ЮРКЕВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Надзея КУДРЭЙКА, Антон РУДАК, Ілья СВІРЫН, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльны карэспандэнт:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД.
Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23.
Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова “КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА”.
Дырэктар — СЛАБОДЗІЧ Ірына Аляксееўна;
першы намеснік дырэктара — КРУШЫНСКАЯ Людміла Аляксееўна.
Прыёмная: (017) 334 57 41.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
*Матэрыял на правах рэкламы.
©“Культура”, 2021.
Наклад 2918. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці.
Падпісана ў друк 19.02.2021 у 20.00. Замова 370.
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства “Выдавецтва “Беларускі Дом друку”.
220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

Абмяркоўваючы

Максім РЫЖАНКОЎ,
першы намеснік Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь:

(З выступлення)

Гэты год быў няпросты ў плане эпідэміялагічнай сітуацыі ў краіне, што, на жаль, не магло не адбіцца і на сферы культуры. Але хацеў бы падкрэсліць, што нават у такіх дастаткова неспрыяльных умовах, галіна — хай і з некаторымі абмежаваннямі праз меры бяспекі, — але ўсё такі функцыянавала. Вобразна кажучы, сэрца культуры ў нашай краіне не пераставала біцца, хоць у многіх краінах свету галіна была практычна максімальна згорнутая. У сувязі з гэтым я хацеў бы ад імя Адміністрацыі Прэзідэнта падзякаваць усім работнікам культуры за тое, што вы працавалі, рэалізоўвалі ў пэўнай ступені свае планы, не спыняліся на дасягнутым нават у такой сітуацыі. Прыемна і тое, што прадстаўнікі сферы культуры напярэдадні Усебеларускага народнага сходу актыўна ўдзельнічалі ў распрацоўцы Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця.

Культура па-ранейшаму застаецца стрыжнем нацыянальнай ідэнтычнасці нашай дзяржавы, асновай ідэалогіі, патрыятызму. Пра гэта гаварыў і Прэзідэнт на Усебеларускім народным сходзе. Вядома, і Прэзідэнт, і яго Адміністрацыя чакаюць, што кожны творчы чалавек, кожны кіраўнік творчага калектыву разумеюць гэтыя простыя ісціны, роўна як і тую адказнасць, якая на іх ускладзена ў гэтай сувязі. Таму што на людзей творчых, таленавітых заўсёды звяртаюць увагу і раўняюцца на іх. Менавіта яны фармуюць светапогляд, шмат у чым вызначаюць грамадскае меркаванне.

Ігар ПЕТРЫШЭНКА,
намеснік Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь:

“Настроіцца на канструктыўнасць”

(З выступлення)

ПРА НЯПРОСТЫ МІНУЛЫ ГОД

Сёння на калегіі прагучалі і праблемы, і канкрэтныя прапановы па іх вырашэнні. Вядома, усё неабходна вывучыць, каб рэалізаваць кожную рацыянальную ідэю. 2020 год быў складаным для краіны ў сувязі з эпідэміялагічнай сітуацыяй, што асабліва адбілася на сферы культуры. Значна знізіліся даходы, — на 43,8 працэнты ў параўнанні з 2019 годам. Скарацілася наведванне спектакляў, канцэртаў. Урадам і Міністэрствам культуры былі прынятыя меры, якія дазволілі забяспечыць бесперапынную работу арганізацый і самае галоўнае — захаваць працоўныя калектывы. Практычна ўсе арганізацыі адукацыі ў сферы культуры не зачыняліся па аналогіі з нашымі суседзямі, а працавалі. Я, канечне ж, хачу падзякаваць усім за самаадданую працу. Аднак не ўсе ўстановы здолелі стрымаць эпідэміялагічны і псіхалагічны ўдар. Дзесьці не хапіла прафесіяналізму, дзесьці захлынулі эмоцыі — ці то творчыя, ці то якія іншыя. Такім чынам, па выніках 2020 года толькі ўстановы вышэйшай адукацыі ў сферы культуры не дапусцілі зніжэння пазабюджэтных даходаў

у параўнанні з узроўнем 2019 года.

У гэтай сітуацыі, калі паглядзець на фінансавыя вынікі, практычна ўсе рэспубліканскія, абласныя музейныя, тэатральна-відовішчныя ўстановы не здолелі аператыўна пера-

задачы і праблемы

“Па-ранейшаму застаецца стрыжнем нацыянальнай ідэнтычнасці нашай дзяржавы”

Гэта значыць ступень іх адказнасці ў нашым грамадстве неверагодна высокая.

Мы чакаем ад творчых людзей, краіна чакае ад іх пры прыняцці рашэнняў узважанага адказнага разумнага падыходу, заснаванага на паўнавартасным поглядзе на ўсе бакі жыцця, на ацэнцы перспектыў устойлівага развіцця нашай краіны, а не на маштабаванні эмацыйных поглядаў асобных людзей, — у гэтым і складаецца асноўная задача для кіраўнікоў творчых калектываў.

Мы шмат зрабілі за апошнія гады для развіцця культуры ў краіне: аднаўляюцца помнікі, адкрываюцца новыя музеі, рэстаўруюцца нашы святыні. І, безумоўна, спыняцца на гэтым нельга. На мой погляд, асаблівую ўвагу трэба надаць і пытанням вяртання культурных каштоўнасцяў з-за мяжы, мы ў гэтым плане не вельмі добра працуем. Гаворка ідзе, вядома, не толькі пра фізічнае вяртанне матэрыяльных каштоўнасцяў, але і аб вяртанні ведаў пра нашу гісторыю, імёнаў, пра якія мы з-за шэрагу прычын забыліся ці не ведалі пра іх, але яны па каранях сваіх — нашы, беларускія. Культура тут, вядома, павінна адыгрываць сваю цэментуючую ролю.

Так склалася, што пандэмія, з аднаго боку, закрыла межы, а з другога, — дала нам вялізныя магчымасці для вывучэння, дэманстрацыі сваёй уласнай краіны. Мне здаецца, гэты фактар мы маглі б выкарыстоўваць для таго, каб нашы маладыя людзі ў масе сваёй нарэшце зразумелі, у якой багатай краіне з пункта гледжання культуры і гісторыі яны жывуць. У гэтым сэнсе ў Міністэрства культуры з Міністэрствам адукацыі павінна быць выбудаваная вельмі плённая пастаянная праца. Не толькі праз падручнікі і кнігі, але і праз аб’екты нашай гістарычнай спадчыны, музеі, выставы, археалагічныя экспедыцыі, праз артэфактныя рэальныя і віртуальныя падарожжы мы павінны прывіваць любоў моладзі да ўласнай краіны, закладваць у іх асновы нашай традыцыйнай культуры, беларускасці.

Вядома, заўтрашні дзень — за маладымі. Таму пошук маладых талентаў, раскрыццё гэтых талентаў, іх падтрымка — гэта і ёсць умацаванне культурнай будучыні нашай краіны, яе каштоўнасцяў і пазнавальнасці ў свеце. Для сапраўднага настаўніка, шырокага і шматграннага, — таленавіты вучань — заўсёды светлая падстава для гонару.

Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

будавацца, скарыстацца інфармацыйнымі тэхналогіямі. Выйгралі тыя, хто прапанаваў неардынарныя праекты, арганізаваў працу з наведвальнікамі ў анлайн-рэжыме.

ПРА ГЕНЕТЫЧНЫ КОД НАЦЫІ

Культура і традыцыі — гэта генетычны код нацыі, і калі ты звязаў сваю дзейнасць з культурай, значыць, ты нясеш у масы прыгажосць, стваральнасць, адзінства, але не разбураеш мір і парадак, створаныя тваімі папярэднікамі. Больш за тое, за гады незалежнасці, нягледзячы на глабалізацыю і інтэрнізацыю, наш культурны падмурак быў прыкметна ўмацаваны. Што дзяржавай не падтрымана ў сферы культуры? Матэрыяльная база ёсць. Усе рэспубліканскія і рэгіянальныя ўстановы культуры адрэстаўраваны і адрамантаваны. Па даручэнні Кіраўніка дзяржавы ствараецца музейны квартал у Мінску. Ужо створана прадпрыемства “Фабрыка піяніна”, што дазволіла ўкамплектаваць установы адукацыі і культуры музычнымі інструментамі. Адрамантаваны інтэрнат Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі і шэраг іншых аб’ектаў, якія міністр тут называў. Таксама па даручэнні Кіраўніка дзяржавы для названай вну закуплены дзесяць раяляў. І такіх прыкладаў мноства. Гэта тычыцца і рэалізацыі творчых праектаў. Усё цікавае і канструктыўнае падтрымліваецца і урадам, і Міністэрствам культуры.

ПРА ГОДНАСЦЬ І ПРАФЕСІЯНАЛІЗМ

Хачу настроіць усіх на канструктыўную і стваральную культурную дзейнасць. І тут крытэрый адзін — найвышэйшая этыка і прафесіяналізм. У нашым грамадстве не павінна быць лішніх або чужых, “нашых” або “не нашых”. Патрабаванне часу — жыць у міры і згодзе. Мы павінны ўдасканальвацца, павінны быць годнымі людзьмі і толькі тады будуць нас паважаць, будуць паважаць нашу гісторыю, культуру, традыцыі і мову.

Часам аб праблемах і дасягненнях мы хутчэй дазнаемся праз сацыяльныя сеткі або тэлеграм-каналы. І туды перамяшчаецца дыскусія, на жаль, не заўсёды канструктыўная, часцей — неканструктыўная. Можа наспеў час стварыць Савет па культуры пра міністэрстве для абмеркавання найбольш вострых тэм? Таксама ў гэтым накірунку неабходна задзейнічаць апякунскія саветы ў арганізацыях культуры, пакуль жа яны ў нас, на жаль, толькі на паперы. Патрэбна дыялогавая пляцоўка, і нам усім разам трэба падумаць, якія яшчэ формы можна ўкараніць у гэтым накірунку.

ПРА АБ’ЕКТЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

Вярнуся да пытання будаўніцтва, рэканструкцыі і капітальнага рамонту аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны і будынкаў устаноў культуры. Усім вядома, што Кіраўнік дзяржавы ў ходзе свайго выступлення на VI Усебеларускім народным сходзе звярнуў увагу на неабходнасць прыняцця ўсіх патрэбных захадаў для захавання гісторыка-культурнай спадчыны нашай краіны. За гады незалежнасці ў гэтым накірунку зроблена шмат. Засяроджуся на праблемных пытаннях, якія набылі, на жаль, сістэмны характар. Зацягваюцца тэрміны распрацоўкі праектнай дакументацыі. Пераносяцца тэрміны здачы аб’ектаў.

Заканчэнне — **на старонцы 5**

"К" інфармуе

Актуаліі дыялогавай пляцоўкі

У сённяшніх рэаліях фармат зацікаўленага дыялогу, у якім нараджаецца кансенсус, узаемаразуменне і ўзаемадавер, і ў якім абмяркоўваюцца найбольш надзённыя пытанні дня, стаў надзвычай актуальным і неабходным у працоўных калектывах. Пра далейшае развіццё гэтага дыскусійнага фармату ва ўстановах сферы гаварылася і 16 лютага на традыцыйнай апаратнай нарадзе міністра культуры Рэспублікі Беларусь Анатолія Маркевіча з начальнікамі ўпраўленняў і аддзелаў міністэрства. Дзякуючы сродкам відэасувязі, удзел у нарадзе прынялі таксама начальнікі ўпраўленняў культуры абласных выканаўчых камітэтаў. Гэтым разам пасяджэнне было прысвечанае абмеркаванню вынікаў Усебеларускага народнага сходу, які адбыўся 11 — 12 лютага бягучага года.

Міністр азнаёміў удзельнікаў нарады з асноўнымі пытаннямі, на якіх у сваім дакладзе рабіў акцэнт Кіраўнік дзяржавы, а таксама распавёў аб тых прапановах, што прагучалі на галоўнай дыялогавай пляцоўцы ад дэлегатаў Сходу для плённай рэалізацыі Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на наступныя пяць гадоў.

Анатолій Маркевіч адзначыў, што сёння Рэспубліка Беларусь дае ўсе магчымасці для развіцця асобы і з’яўляецца самастойнай на міжнароднай арэне. Наша краіна разглядаецца як паноўная вышыня і здолее захаваць самастойнасць, што і дэманструе ўсёй сусветнай супольнасці, захоўваючы накірунак да шматвектарнага міжнароднага супрацоўніцтва. Вялікая ўвага была нададзеная становішчу беларусаў, якія знаходзяцца за межамі краіны — яны застаюцца грамадзянамі нашай дзяржавы, і іх падтрымка надзвычай важная, з імі трэба выбудоўваць канструктыўнае супрацоўніцтва.

Неабходна актывізаваць прыцягненне работнікаў культуры ў інфармацыйную прастору для супрацоўніцтва са сродкамі масавай інфармацыі. Грамадства прыслухоўваецца да людзей мастацтва, ім вераць і давяраюць. Застаецца актуальным і вызначэнне нестандартных форм падачы тэмы патрыятызму для моладзі.

Трэба пазбягаць штампаў і фармальных падыходаў пры рабоце з маладымі людзьмі, размаўляючы з імі, як з роўнымі, выслухоўваючы іх надзённыя патрэбы, ведучы з імі дыялог. Вялікую ўвагу трэба надаць выхаванню маладых грамадзян, прафарыентацыйнай рабоце ва ўстановах адукацыі. У гэтай сферы плануецца ўкараненне найноўшых тэхналогій, дыстанцыйнага навучання, што з’яўляецца надзвычай актуальным, дыферынцыяванага падыходу да ўступнай кампаніі, які дазволіць пабачыць патэнцыял будучага навучэнца. Таксама неабходна ўзважана падысці да пытання мэтавага набору ва ўстановы вышэйшай адукацыі.

Была надзеленая ўвага і пытанню падвышэння ўзроўню заработнай платы работнікаў культуры, актывізацыі пазабюджэтнай дзейнасці і стварэння ўмоваў, у якіх установы культуры здолеюць зарабляць. Развіццё немагчымае, калі няма канкурэнцыі ідэй і думак, якія маглі б рухаць сферу культуры наперад, да чаго варта імкнуцца.

Міністр выказаў падзяку ўсім выканаўцам і творчым калектывам, агульнай колькасцю каля васьмісот чалавек, што прынялі ўдзел у канцэрце, які адбыўся падчас правядзення Усебеларускага народнага сходу і прадэманстраваў высокі ўзровень развіцця айчыннай культуры і яе надзвычайную разнастайнасць.

Працягам Усебеларускага сходу ў найбліжэйшы час мусіць зрабіцца далейшае абмеркаванне яго вынікаў ва ўстановах культуры ў фармаце дыялогавай пляцоўкі, якая дапаможа вызначыць перспектыўныя накірункі работы і развіцця грамадства.

К

КУЛЬТУРА
WW.KIMPRESS.BY
№ 8 / 20 ЛЮТАГА 2021 г.

“Культура дапамагае нам адчуваць сябе адзіным і самабытным народам”

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 2)

ПРАФЕСІЙНАЕ МАСТАЦТВА

Ва ўмовах эпідэмічных абмежаванняў творчыя калектывы сталі актыўна асвойваць новыя формы працы: анлайн-паказы спектакляў і канцэртаў на сваіх сайтах, стварэнне і паказ іх тэлеверсій і іншыя.

Дадзены вопыт тэатрам і канцэртным арганізацыям трэба будзе максімальна эфектыўна выкарыстоўваць у 2021 годзе пры выкананні гадавых планаў работы, устаноўленых на ўзроўні паказчыкаў Дзяржаўнай праграмы “Культура Беларусі” на 2021 — 2025 гады.

У 2021 годзе тэатральна-відовішчным арганізацыям неабходна забяспечыць паўнавартасную працу як у традыцыйным, так і ў анлайн-фарматах, надаўшы асаблівую ўвагу стварэнню тэлевізійных і інтэрнэт-версій спектакляў і канцэртаў у рамках акцыі “Культура анлайн”.

Пры фарміраванні рэпертуарнай палітыкі прыярытэтная ўвага павінна быць нададзена пастаноўкам і канцэртным праграмам паводле твораў беларускіх кампазітараў і драматургаў, а таксама мерапрыемствам патрыятычнай накіраванасці, якія адлюстроўваюць тэматыку Года народнага адзінства.

Пры стварэнні і набыцці твораў выяўленчага і манументальнага мастацтва прыярытэтнымі напрамкамі павінны стаць закупкі твораў маладых мастакоў і майстроў з рэгіёнаў, што дазволіць максімальна поўна прадставіць увесь зрэз сучаснага мастацтва ў калекцыях рэспубліканскіх і абласных музеяў.

Наспела неабходнасць пашырэння напрамкаў і кола атрымальнікаў заахвочванняў Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі з улікам сучаснага ўзроўню развіцця мастацтва.

АДУКАЦЫЯ

У 2021 годзе будзе ўзмоцнена праца па выяўленні таленавітай моладзі. Па ўсёй краіне запланавана звыш 180 мастацка-творчых спаборніцтваў для дзяцей і моладзі. У рэгіянальных і сталічных музеях, тэатрах і бібліятэках павінны прайсці культурныя мерапрыемствы, накіраваныя на фарміраванне маральных каштоўнасцяў і грамадзянска-патрыятычнае выхаванне.

Абапіраючыся на традыцыі і актыўна выкарыстоўваючы інавацыі, установы адукацыі ў сферы культуры выконваюць сваю функцыю па падрыхтоўцы прафесійных кадраў для сферы культуры.

Разам з тым, застаецца актуальнай праблема забеспячэння ўстаноў сферы культуры ў рэгіёнах спецыялістамі з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй.

У сувязі з гэтым перад упраўленнямі і аддзеламі абл-, гар- і райвыканкамаў стаіць задача па правядзенні аналізу кадравага складу арганізацый сферы культуры, унясенні заявак на падрыхтоўку спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыяй, стварэнні ўмоў па замацаванні маладых спецыялістаў на месцах і паляпшэнні іх жыллёвых умоў. Асаблівую ўвагу трэба надаць фармаванню заявак на мэтавую падрыхтоўку спецыялістаў для патрэб сваіх рэгіёнаў.

Задача заснавальнікаў устаноў адукацыі ў сферы культуры заключаецца ў карэкціроўцы аб’ёму падрыхтоўкі спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыяй з улікам патрэб рынку працы рэгіёнаў і раўнамерным размеркаванні выпускнікоў па ўсёй краіне.

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

Наша дзяржаўная культурная палітыка накіравана на тое, каб не толькі захаваць народныя мастацкія традыцыі, але і стварыць умовы для іх жывога развіцця, рабіць іх прывабнымі і паказваць іх унікальнасць як у нашай краіне, так і за яе межамі.

Сёння неабходна актыўна працягваць працу над стварэннем культурных брэндаў, у аснове якіх стануць рэгіянальныя фестывалі народнай творчасці, якія ў сукупнасці дэманструюць элементы абрадавых традыцый, фальклор, нацыянальную кухню і народныя мастацкія рамёствы.

МУЗЕІ І МУЗЕЙНАЯ СПРАВА

Пытанні стану і перспектыў развіцця дзяржаўных музеяў былі разгледжаны ў снежні 2020 года на выязной калегіі Міністэрства культуры. Па выніках вызначаны першачарговыя мэты і задачы. У тым ліку ў 2021 годзе музеям неабходна актывізаваць работу па прыцягненні на сістэмнай аснове навучэнцаў і студэнтаў устаноў адукацыі цікавымі формамі працы з новым зместам, удасканаленні якасці паслуг, накіраваных на прыцягненне індывідуальных наведвальнікаў, “сямейных груп”, развіцці доўгатэрміновага міжнароднага супрацоўніцтва, прыцягненні спонсарскай дапамогі для рэалізацыі экспазіцыйных, выдавецкіх, культурна-адукацыйных і іншых праектаў, укараненні ў музеях Беларусі новых відаў віртуальных паслуг з наступнай іх камерцыялізацыяй.

БІБЛІЯТЭКІ І БІБЛІЯТЭЧНАЯ СПРАВА

Імкнучыся замясціць фізічнае наведванне аддаленымі формамі абслугоўвання, бібліятэкі актывізавалі сваю дзейнасць у інтэрнэт-прасторы: стварылі новыя анлайн-рэсурсы і паслугі. Дадзеныя сэрвісы карыстаюцца актыўным попытам у насельніцтва. Так, у 2020 годзе колькасць віртуальных наведванняў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі перавысіла 1,3 мільёна, што больш за паказчык 2019 года на 25%.

Дасягненні бібліятэк былі адзначаны на высокім дзяржаўным узроўні. Аўтарскі калектыў установы культуры “Магілёўская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна” ўдастоены спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва за дасягненні ў справе выхавання любові да роднага краю, стварэнне інфармацыйных рэсурсаў, прысвечаных тэме малой радзімы.

У цяперашні час існуе аб’ектыўная неабходнасць у вызначэнні новых падыходаў да камплектавання фондаў бібліятэк за кошт бюджэтных сродкаў.

КІНЕМАТАГРАФІЯ

Дзяржавай прыняты меры падтрымкі Нацыянальнай кінастудыі “Беларусьфільм”. Падрыхтаваны і ўнесены ва Урад адпаведныя акты, якія дазволяць у пэўнай ступені стабілізаваць сітуацыю.

Распрацаваны тэматычныя пакеты і індывідуальныя прапановы па кантэнце (гульнявыя, негульнявыя, анімацыйныя фільмы). Дадзеныя матэрыялы прызначаны для працы непасрэдна з тэлевізійнымі каналамі і інтэрнэт-платформамі, а таксама з кампаніямі і агентамі па продажы па ўсім свеце.

З мэтай паляпшэння сітуацыі ў сферы кінематаграфіі вызначаны першарадныя задачы: рэалізацыя комплексу мер па стабілізацыі фінансава-эканамічнага становішча кінастудыі за кошт памяншэння выдаткаў і сабекошту канчатковага прадукту, прыцягненне маладых спецыялістаў да рэалізацыі кінапраектаў розных тэматыкі, накіраваных на патрыятычнае выхаванне моладзі, забеспячэнне бясстратнай работы кінавідэапракатных арганізацый.

АХОВА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

Адным з асноўных напрамкаў дзяржаўнай палітыкі ў сферы культуры, найважнейшай задачай, без рашэння якой немагчыма ўявіць будучыню любой дзяржавы, з’яўляецца захаванне культурнай спадчыны краіны.

У 2021 годзе будуць працягнуты работы на помніках архітэктуры ў аграгарадках Гальшаны, Крэва, Жылічы, Юравічы, вёсках Закозель, Свяцк, Пустынкі, гарадах Гродне, Навагрудку, Косаве, Полацку, Мінску, у гарадскім пасёлку Ружаны і іншых.

Сярод важных задач бліжэйшай перспектывы варта адзначыць распрацоўку і ўнясенне ў UNESCO новых дасье ў мэтах пашырэння прысутнасці беларускіх аб’ектаў у спісах нематэрыяльнай культурнай спадчыны UNESCO, павелічэнне колькасці адрэстаўраваных і прыстасаваных пад сучасныя патрэбы помнікаў архітэктуры. Выканкамам неабходна надаць асаблівую ўвагу пытанням пералічэння суб’ектамі гаспадарання адлічэнняў у Фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

МАТЭРЫЯЛЬНА-ТЭХНІЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ

У чэрвені 2021 года неабходна ўвесці першы і чацвёрты пускавыя комплексы Нацыянальнага мастацкага музея, будаўнічая гатоўнасць якіх складае 99% і 83%. Для гэтага неабходна забяспечыць штотыднёвы маніторынг працы на аб’екце, у тым ліку правядзенне аператыўных нарад, зацвердзіць графікі вытворчасці і завяршэння работ, а таксама прыняць меры па засваенні грашовых сродкаў.

У мінулым годзе завершана рэалізацыя праекта Саюзнай дзяржавы “Капітальны рамонт, рэстаўрацыя і музеефікацыя збудаванняў Брэсцкай крэпасці ў мемарыяльным комплексе “Брэсцкая крэпасць-герой”. У бягучым годзе неабходна распрацаваць праект Саюзнай дзяржавы, які будзе прадугледжваць правядзенне новых работ у Брэсцкай крэпасці. У далейшым неабходна актывізаваць работу па прыцягненні сродкаў Саюзнай дзяржавы на іншыя аб’екты гісторыка-культурнай спадчыны.

У бягучым годзе неабходна забяспечыць жорсткі кантроль за выкарыстаннем сродкаў бюджэту, што накіроўваюцца на фінансаванне аб’ектаў дзяржінвестпраграмы, а таксама забяспечыць выкананне даручэння Кіраўніка дзяржавы па набыцці музычных інструментаў.

МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Культурная дыпламатыя — адзін з важных элементаў знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь. У цяперашні час дзейнічае 79 міжнародных дагавораў з 52 краінамі.

На 2021 год Міністэрствам запланаваны шэраг значных міжнародных мерапрыемстваў як у Беларусі, так і за яе межамі. Сярод іх Дні культуры Рэспублікі Беларусь у

“Настроіцца на канструктыўнасць”

(Заканчэнне. Пачатак на старонках 2 — 3)

Няякасна выконваюцца будаўнічыя і рэстаўрацыйныя работы. Усё гэта прыводзіць да падаражання кошту работ, і, як следства, вось ужо два гады вядзецца рамонт сцэны Нацыянальнага акадэмічнага рускага тэатра імя Максіма Горкага, доўгабудам стала будаўніцтва новага будынка Мінскага дзяржаўнага мастацкага каледжа імя А.К. Глебава, перанесены тэрміны ўводу аб’ектаў музейнага квартала, Косаўскага палацава-паркавага ансамбля. На гэтыя факты ўвагу Міністэрства культуры звярталі і урад, і Камітэт дзяржаўнага кантролю. Але, на жаль, воз стаіць на месцы. Прашу ўзяць гэтыя пытанні на асобы кантроль і разам з аблвыканкамамі рацыянальна размеркаваць рэсурсы і надалей зыходзіць з прынцыпа: не пачынаць будаўніцтва новых аб’ектаў без завяршэння работ на тых, што ўжо ёсць.

Неабходна таксама актывізаваць працу па далучэнні інвестыцыйных рэсурсаў. Так, гэта няпроста. Але аб’екты гісторыка-культурнай спадчыны павінны быць далучанымі да турыстычнай сферы. Міністэрствам спорту і турызму сумесна з аблвыканкамамі быў распрацаваны план аб перадачы аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны — палацава-паркавых сядзібаў — уласнікам з мэтай развіцця аграэкатурызму. Прааналізаваўшы, мы бачым, што станоўчых прыкладаў у дадзеным добрым праекце — толькі адзінкі. Я папрашу разабрацца, што перашкаджае, чаму не знойдзены баланс інтарэсаў дзяржавы і прыватніка? Што неабходна зрабіць? Тым больш, што цяпер Міністэрства культуры працуе над унясеннем змен і дапаўненняў у Кодэкс аб культуры. Ёсць магчымасць з улікам практыкі выпрацаваць і ўнесці канструктыўныя прапановы па далучэнні аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны ў развіццё рэгіёнаў і турыстычнай галіны. Давайце ісці ад жыцця, каб максімальна задзейнічаць усе гэтыя сядзібы, а не чакаць капітальных бюджэтных укладанняў. Таму я папрашу ў частцы нарматыўна-прававога ўдасканальвання і ў частцы ўвядзення інвеставання ў рамках дзяржаўнага і прыватнага партнёрства, любых іншых аспектах разам з Міністэрствам спорту і турызму, з аблвыканкамамі Міністэрству культуры ўключыцца ў справу і, я думаю, тут будзе адпаведны вынік сумеснай працы.

Праблемным застаецца пытанне будаўніцтва новага будынка Нацыянальнага гістарычнага музея. А будаўніцтва ж гэтага аб’екта і стварэнне маштабнай музейнай экспазіцыі павінны стаць асновай беларускага патрыятызму, сімвалам дзяржаўнасці і незалежнасці нашай краіны.

ПРА ПАТЭНЦЫЯЛ ТВОРЧАЙ МОЛАДЗІ

Работа з творчай моладдзю. Зрухі ёсць.Ужо сталі прыкметнымі новыя творчыя імёны, з’явіліся новыя таленавітыя выканаўцы і калектывы ў праграмах канцэртаў, прысвечаных знакавым дзяржаўным датам, але расслабляцца не варта. Прашу актыўней працаваць з рэгіёнамі. Магчыма, трэба стварыць банк даных “Новыя імёны”, дзе павінны быць цікавыя рэжысёры, сцэнарысты, маладыя выканаўцы, каб іх далучаць да арганізацыі і правядзення розных знакавых рэспубліканскіх і рэгіянальных праектаў і мерапрыемстваў. Сёння ў кожнай установе адукацыі сферы культуры ёсць пляцоўкі для рэалізацыі творчых здольнасцяў таленавітай моладзі. У гэтым навучальным годзе ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтва ўведзены ў эксплуатацыю культурна-спартыўны цэнтр з найвыдатнай залай і сцэнічнай пляцоўкай, а яна — прастойвае. Трэба актыўней падключаць рэгіёны і яе выкарыстоўваць. У Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў завершана мадэрнізацыя тэатральнай залы. Усе таленты там павінны быць задзейнічаны, а таму далучайце і творчыя саюзы. У нас створаны і функцыянуе Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў. Але як ён задзейнічаны ў выяўленні і прасоўванні маладых мастакоў, скульптараў, дызайнераў? Я пра гэта нічога не пачуў. Таму прашу разам з рэктарамі вну ў сферы культуры, кіраўніцтвам Маладзёжнага тэатра эстрады выпрацаваць новыя падыходы ў працы з творчай моладдзю па эфектыўным і рацыянальным выкарыстанні існуючых пляцовак вну і буйных арганізацый культуры. Неабходна прапрацаваць з рэгіёнамі магчымасць правядзення на дадзеных пляцоўках розных маладзёжных культурных мерапрыемстваў, аглядаў-конкурсаў, падключыўшы прафсаюзы, БРСМ.

ПРА МУЗЕЙНЫ КАНТЭКСТ

Асобная тэма — дзейнасць музейных устаноў. Трэба ісці ў нагу з часам, з развіццём інфармацыйных тэхналогій. Толькі пісьменны менеджмент забяспечыць поспех: пастаяннае абнаўленне музейных экспазіцый, інфармацыя аб выставах на сайтах і ў сацыяльных сетках, увядзенне новых паслуг, зніжак па гасцінічнай карце, правядзенне прэзентацый і культурных мерапрыемстваў ды многае іншае. Сёння Кіраўніком дзяржавы пастаўлена задача развіваць унутраны турызм. І тут значная роля належыць музейным установам у кантэксце фарміравання дзяржаўнай ідэалогіі і патрыятызму. Гэта ключавое пытанне, і мы павінны эфектыўна задзейнічаць усе матэрыяльныя рэсурсы. Прыватныя музейныя праекты атрымліваюць сваё развіццё, чым і прыцягваюць наведвальнікаў, але чаго, на жаль, не скажаш пра нашы дзяржаўныя музеі. Звяртаю ўвагу ўсіх кіраўнікоў дзяржаўных арганізацый — сёння трэба напружвацца кожнаму на сваім працоўным месцы, трэба літаральна завабліваць і чытача, і гледача, і наведвальніка.

ПРА КІНАВІДЭАПРАКАТ

Кінапракатным арганізацыям штогод аказваецца дзяржаўная падтрымка з мясцовых бюджэтаў. У той жа час актыўна развіваецца недзяржаўны сектар у гэтай сферы. І мы бачым, што нягледзячы на высокія кошты ў прыватных кіназалах, нашы прадпрыемствы пачынаюць прайграваць і губляць гледача. За бюджэтныя грошы закупіць фільмы і паказаць іх у кінатэатры — гэта вельмі проста, але пытанне тут у іншым: што паказваюць, асабліва ў рэгіёнах і населеных пунктах. У абласцях — розныя сістэмы кіравання дадзенымі арганізацыямі. Толькі ў Мінску і Мінскай вобласці функцыянуе адзіная структура і сістэма кіравання кінатэатрамі і кінапракатнымі арганізацыямі. Так КУП “Мінскаблкінавідэапракат” мае 21 раённае структурнае падраздзяленне. Бюджэтныя і пазабюджэтныя сродкі тут акумулююцца і рацыянальна размяркоўваюцца — і ў плане мадэрнізацыі раённых кінатэатраў, і закупкі фільмаў, і рэалізацыі дзяржаўнай культурнай палітыкі. Гэтаксама арганізавана і ў Мінску. У астатніх жа абласцях — хто на што здатны. Кінапракат далучаны да клубаў, да аддзелаў культуры, а ў Полацку — да парку культуры і адпачынку. У Глузску кінатэатр перададзены культурна-забаўляльнаму цэнтру, а ў Шклове — упраўленню адукацыі. Мадэрнізацыя раённых кінатэатраў не праводзіцца, а значыць і фільмы, якія стварае Нацыянальная кінастудыя “Беларусьфільм”, не змогуць дайсці да людзей. Папрашу Міністэрства культуры сумесна з аблвыканкамамі прааналізаваць дзейнасць кінапракатных арганізацый і выпрацаваць адпаведныя прапановы па іх эфектыўнай рабоце і рацыянальным выкарыстанні бюджэтных сродкаў.

■■■

Бягучы год абвешчаны Годам народнага адзінства. На работнікаў галіны культуры ўскладаецца вялікая адказнасць і праца. Бо ў аснове народнага адзінства — традыцыі, духоўнасць, патрыятызм. Падкрэсліваю значнасць і неабходнасць актыўнасці арганізацый культуры, работнікаў культуры ў правядзенні культурных і памятных мерапрыемстваў, прысвечаных Году народнага адзінства. Прашу ўсіх настроіцца на канструктыўную ды ініцыятыўную работу.

Працяг тэмы калегіі — у наступным нумары

Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Казахстане, у Кітайскай Народнай Рэспубліцы, у Расійскай Федэрацыі і ў Рэспубліцы Татарстан. Рэспубліка Таджыкістан плануе правядзенне ў нас у краіне сваіх Дзён культуры. Будзе працягнута паглыбленне інтэграцыі ў культурнай сферы з Расійскай Федэрацыяй, супрацоўніцтва з Кітаем.

Важнай задачай з’яўляецца пошук новых форм работы з грамадскімі аб’яднаннямі беларусаў замежжа. Работа праводзіцца на сістэмнай аснове, аднак у гэты працэс трэба больш актыўна ўключаць рэгіёны Беларусі. Запланаваны на 2021 год Фестываль мастацтваў беларусаў свету павінен стаць пляцоўкай для ўстанаўлення новых кантактаў, абмеркавання перспектыў узаемадзеяння.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ДЗЕЙНАСЦІ СФЕРЫ КУЛЬТУРЫ

У 2020 годзе высокую запатрабаванасць у насельніцтва набылі мерапрыемствы ў анлайн-фармаце. Сучасныя тэхналогіі робяцца стрыжнем новай філасофіі прасоўвання культуры, і ў гэтым працэсе трэба актыўна шукаць кароткія шляхі дасягнення вынікаў. Напрыклад, прыцягваць да супрацоўніцтва кампаніі-распрацоўшчыкі інфармацыйных тэхналогій, укараняць міжнародны досвед.

Віртуальныя экскурсіі, выставы, тэатральныя пастаноўкі і канцэрты — гэта не толькі выдатны дадатак да традыцыйнага культурнага жыцця, але і магчымасць пашырэння камерцыйнай дзейнасці.

Рэгіёны сёння, як ніколі, маюць унікальную магчымасць распавесці ў інтэрнэт-прасторы пра сябе велізарнай колькасці людзей, зацікаўленых у адкрыцці новых маршрутаў, наведванні музеяў і выстаў, прыцягнуць гледача і турыста не толькі з Беларусі, але і краін блізкага і далёкага замежжа.

Сённяшняя эпідэміялагічная сітуацыя — гэта выклік культурнай прасторы краіны, але гэты выклік адкрывае і новыя магчымасці па прэзентацыі найбагацейшай, шматграннай беларускай культуры за мяжой.

Неабходна інтэнсіўна працаваць над інфарматызацыяй сферы, фарміраваннем нацыянальнага кантэнту на аснове найлепшых твораў сучаснай беларускай культуры. Гэта значна пашырыць гарызонты яе пазнавальнасці.

Паважаныя калегі! У Год народнага адзінства мы павінны ўнесці свой важкі ўклад ва ўмацаванне беларускай дзяржаўнасці, узмацніць значнасць беларускай культуры ў патрыятычным выхаванні.

Своечасова заўважыць і падтрымаць талент, стварыць прывабныя ўмовы для яго раскрыцця — агульная задача дзяржавы, кіраўнічых і творчых кадраў.

Збалансаванасць фінансавання ў сферы культуры паміж дзяржаўным бюджэтам, уласнымі сродкамі, спонсарскай і мецэнацкай дапамогай, цесная праца з рэгіёнамі, партнёрства з усімі суб’ектамі культурнай дзейнасці незалежна ад узроўню падпарадкаванасці — вось асноўныя напрамкі і задачы нашай працы на 2021 год!

Завяршаючы свой даклад, хачу падзякаваць кожнаму з вас за працу і выказаць надзею на прадуктыўную працу ў далейшым!

Скарбы матчынай мовы

21 лютага ва ўсім свеце адзначаецца Міжнародны дзень роднай мовы, што ладзіцца пад эгідай UNESCO. Натуральна, не застаецца ўбаку ад гэтай важнай даты і Беларусь. Пра тыя цікавосткі, якія чакалі і чакаюць аматараў роднай мовы на гэтым і наступным тыдні, "К" пагутарыла з выконваючай абавязкі вучонага сакратара Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Вольгай МІЦКЕВІЧ.

— Вольга Уладзіміраўна, якія ўрачыстасці з нагоды Дня роднай мовы пройдуць пад эгідай Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі? Што найбольш адметнага і цікавага ў сённяшняй праграме святкаванняў?

— Да Міжнароднага дня роднай мовы Інстытутам мовазнаўства імя Якуба Коласа (гэта адзін з філіялаў нашага Цэнтра) запланавана правядзенне шэрагу акцый — круглых сталоў, прэзентацый, мерапрыемстваў адукацыйна-забаўляльнага характару. Напрыклад, 15 лютага ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі быў праведзены круглы стол "Акадэмік Яўхім Карскі — заснавальнік беларускага навуковага мовазнаўства і літаратуразнаўства, этнограф, фалькларыст, палеограф", у якім узяў удзел і праўнук слынная беларуса — архівіст Аляксандр Карскі, які сёння жыве ў Санкт-Пецярбургу і далучыўся да нас праз відэа-канферэнцыю ў Zoom. Аляксандр Карскі распавёў пра тое, як задумвалася і ствaралася грунтоўная навукова-папулярная праца — двухтомнае выданне "Академик Е.Ф. Карский. Биография", апублікаванае некалькі гадоў таму ў Мінску. Таксама ўвазе ўдзельнікаў і гасцей круглага стала была прэзентаваны шэраг унікальных фотаздымкаў з падборкі аўтара. Натуральна, выступалі і іншыя айчынныя і замежныя даследчыкі, якія расказвалі пра разнастайныя бакі жыцця і навуковай дзейнасці Я. Ф. Карскага.

— Тэматыка падобных акцый закранае толькі беларускую мову? Ці ідзе гаворка і пра іншыя мовы, што стала прысутнічаюць на Беларусі?

— Падчас правядзення запланаваных мерапрыемстваў мы, у асноўным, арыентуемся на прыцягненне ўвагі, на дэманстрацыю дасягненняў беларускай мовы, літаратуры, нацыянальнай культуры ўвогуле. Разам з тым, не сакрэт, што беларуская мова мела і мае доўгі перыяд узаемаадносін з польскай, літоўскай, украінскай, рускай мовамі. Акрамя таго, не варта забываць, што на Беларусі здаўна жылі татары, якія яшчэ ў XVI стагоддзі стваралі кітабы — шматмоўныя рукапісы, напісаныя арабскім пісьмом. У кітабах дамінуе тагачасная беларуская дыялектная мова, адлюстраваны побыт, звычаі, традыцыі татараў-перасяленцаў, таму іх тэксты — каштоўны матэрыял для лінгвістаў, этнографаў, літаратуразнаўцаў, гісторыкаў.

Пра кітабы, дарэчы, можна было шмат даведацца 16 лютага, падчас правядзення круглага стала "Беларуская мова ў кітабах", зладжанага Інстытутам мовазнаўства. У мерапрыемстве прынялі ўдзел вядучыя ў Беларусі спецыялісты ў галіне кітабістыкі і шырэй — арыенталістыкі, — якія падзяліліся вынікамі сваіх даследаванняў. Асобна варта вылучыць выступленні муфція Духоўнага ўпраўлення мусульман Беларусі Алі Вараноўіча і старшыні Савета імамаў Беларусі, аспіранта Інстытута мовазнаўства Дзмітрыя Радкевіча, якія закранулі адно з важных пытанняў — пераклады Карана на беларускую мову: інфармацыя пра існуючыя (даўнейшыя і сучасныя) пераклады фрагментаў; здагадкі, якія пакуль што не маюць дакументальнага пацвярджэння і грунтуюцца на ўскосных звестках, пра магчымае існаванне перакладу Карана на беларускую мову яшчэ ў часы ВКЛ; сённяшняя работа над перакладам Карана, праблемы мовазнаўчага характару, з якімі сутыкаюцца перакладчыкі, і іх вырашэнне.

— Думаю, не памылюся, калі скажу, што навукоўцы даволі часта робяць адкрыцці, звяртаюць увагу на нейкія "белыя" плямы ў гісторыі беларускага мовазнаўства, беларускай літаратуры, адшукваюць архіўныя звесткі пра тых або іншых славутых асоб. Ці ёсць чым пахваліцца ў гэтым плане навукоўцам Цэнтра?

— Думаю, падобныя знаходкі і адкрыцці здараюцца не так часта, як таго хацелася б даследчыкам той ці іншай галіны беларускай культуры. Разам з тым, вяртанне з забыцця невядомых матэрыялаў часам здараецца. Напрыклад, у рамках святкавання Дня роднай мовы, 16 лютага ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі адбылася прэзентацыя кнігі "Шкляр Г.З. Выбраныя працы. Моўная спадчына". Названая кніга — сумесны праект супрацоўнікаў нашага Інстытута мовазнаўства і Кастрамскога ўніверсітэта з Расійскай Федэрацыі.

З'яўленне названай кнігі мае надзвычай важнае значэнне для беларускага мовазнаўства. Справа ў тым, што гісторыя захавала для нашчадкаў досыць сціплыя звесткі пра гэтага адметнага даследчыка. Тым не менш, Герцалю Залманавічу Шкляру належыць асаблівае месца ў гісторыі нацыянальнай лінгвістыкі: у перадваенны час ён удзельнічаў у складанні руска-беларускага і беларуска-рускага слоўнікаў, гісторыя стварэння якіх да канца не асветленая і не вывучаная. У Беларусі лінгвіст працаваў у розных галінах мовазнаўчай навукі — у галіне гебраістыкі і беларусазнаўства. Для нас, для беларускага мовазнаўства, вяртанне імя Г. З. Шкляра — гэта найперш вяртанне ў навуковы ўжытак арыгінальных лінгвістычных ідэй, метадалагічных падыходаў да вырашэння шматлікіх праблем у галіне лексікалогіі. Акрамя таго, з выданнем гэтай кнігі пашыраюцца нашы звесткі пра гісторыю і асаблівасці функцыянавання нацыянальнай навукі Беларусі ў адметныя перыяды яе развіцця.

— Але ж, мабыць, нейкія адкрыцці навукоўцы могуць рабіць не толькі ў архівах, але і падчас палявых даследаванняў. Маю на ўвазе дыялектолагаў, якія дасюль, і ў XXI стагоддзі, у эпоху гаджатаў і касмічных караблёў, вандруюць па вёсках у пошуках самабытнага, арыгінальнага, новага ці, можа, старадаўняга, беларускага слова...

— Так, адкрыцці ў дыялекталогіі здараюцца і цяпер, у нашы часы. Не сакрэт, што беларуская дыялектная мова — гэта неацэнны скарб, да якога звярталіся, звяртаюцца і будуць звяртацца беларускія пісьменнікі (адразу згадваюцца, канечне, Іван Мележ, Вячаслаў Адамчык), музыканты (успомню тут Уладзіміра Мулявіна і "Песняроў"), культурныя дзеячы (менавіта на палескай гаворцы ладзіцца пастаноўка "Пінскай шляхты" В.Дуніна-Марцінкевіча ў Палескім драматычным тэатры ў Пінску). А каб паказаць усё багацце дыялектнага маўлення жыхароў Беларусі, мы зладзілі прэзентацыю дакументальнага фільма "Гаворкі Беларусі", які створаны супрацоўнікамі сайта Onliner і Інстытута мовазнаўства пры падтрымцы кампаніі A1. Цягам двух тыдняў, з 9 па 19 лютага, стужка была прэзентавана ў многіх універсітэтах Беларусі. Дадам, што фільм быў створаны па сцэнарыі Вадзіма Шклярыка, старшага навуковага супрацоўніка аддзела дыялекталогіі і лінгвагеаграфіі Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа.

— Калі мы ўжо закранулі тэму найноўшых тэхналогій, дык што ў гэтым кірунку робіцца ў Цэнтры даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі?

— Напрыклад, падчас Тыдня роднай мовы мы прэзентавалі электроннае перавыданне класічнай працы Івана Насовіча "Словарь белорусского наречия" — галоўнай крыніцы слоўнікаў беларускай мовы канца XIX — першай паловы XX стагоддзя. Гэта праца — найперш праект выдавецтва "Тэхналогія", да якога спрычыніліся і нашы супрацоўнікі. Электроннае перавыданне ўтрымлівае арыгінальныя і асучасненыя рэестры, арыгінальны тэкст і дадаткі; дапоўнена матэрыяламі крытычнага, біяграфічнага і бібліяграфічнага характару, забяспечана магчымасцю пошуку па тэксце і па ключавых словах, падабраных да аўтарскіх рускамоўных дэфініцый.

Калі гаварыць пра электронныя выданні, то нельга не згадаць "Канкарданс беларускай мовы XIX стагоддзя", які ўжо вытрымаў два перавыданні. Канкарданс уяўляе з сябе параўнальна новы для беларускай лексікаграфіі тып даведнікаў. Гэты слоўнік (лепш сказаць, комплекс слоўнікаў), папяровая версія якога склала б шматтомнае выданне памерам не менш за 25 — 30 тамоў, уключае ўласна канкарданс, гэта значыць літаральна ўсе адзначаныя формы слоў, частотныя і адваротныя слоўнікі, а таксама тэксты твораў (у большасці сваёй аўтэнтычныя) і іншыя даведачныя матэрыялы. Выданне з'яўляецца эфектыўным інструментам для даследавання беларускай мовы на этапе фарміравання яе літаратурнай формы.

Нельга таксама абысці ўвагай і сумесную працу супрацоўнікаў нашага інстытута і праграмістаў над Беларускім N-корпусам, які з'яўляецца першай спробай стварэння публічнага агульнага корпуса беларускай мовы і знаходзіцца ў адкрытым доступе (https://bnkorpus.info/). На сённяшні дзень аб'ём Асноўнага корпуса складае прыкладна 163 мільёна словаўжыванняў.

— І апошняе пытанне. Ведаю, што справа перакладу заканадаўчых тэкстаў на беларускую мову дасюль рухаецца даволі павольна. Ці ёсць у гэтай справе зрухі, ці працягнецца публікацыя законаў, Кодэксаў, указаў і дэкрэтаў на беларускай мове ці, дакладней кажучы, па перакладзе названых нарматыўных дакументаў з рускай мовы на беларускую?

— Якраз 22 лютага, у гэты панядзелак, у Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа будзе праведзены круглы стол пад назвай "Стварэнне беларускамоўнай заканадаўчай базы як фактар гарманічнага развіцця грамадства". Удзел у пасяджэнні прымуць супрацоўнікі Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь, члены Экспертнага савета па пытаннях перакладу заканадаўчых актаў на беларускую мову, члены Рэспубліканскай тэрміналагічнай камісіі пры НАН Беларусі, выкладчыкі, якім можна будзе задаць агучаныя вамі пытанні. Таму запрашаем "Культуру" на гэтую і на іншыя імпрэзы нашага Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. Упэўнена, што наша супрацоўніцтва з "Культурай" будзе плённым і ўзаемакарысным.

Занатаваў Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

XXVIII Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш, якая праходзіць у вядомым усім адміністратыўным комплексе "Рамонак" (пр. Пераможцаў, 14) у перыяд з 18 па 21 лютага, сабрала пад сваім дахам 281 экспанент з 20 краін. Дэвіз сённяшняй выставы — "Кніга аб'ядноўвае людзей і краіны". Свае экспазіцыі ў агульнай прасторы "Рамонка" прадставілі Венесуэла, Украіна, Турцыя, ЗША, Палесціна, Ізраіль, Пакістан, Ісламская рэспубліка Іран, Расія, КНР, Сербія, Германія, Казахстан, Францыя, Арменія і іншыя краіны свету.

"Кніга аб'ядноўвае людзей і краіны"

Зміцер ЮРКЕВІЧ / Фота аўтара

ЭКСПАЗІЦЫЯ З ПРЭЗЕНТАЦЫЯЙ

Найбольш поўна, як гаспадыня форуму, прадэманструе свае дасягненні Беларусь. Нашу краіну прадстаўляюць не толькі дзяржаўныя і прыватныя выдавецтвы, але і розныя ўстановы, напрыклад, штогадовы ўдзельнік выставы — Нацыянальная бібліятэка Беларусі. Кожная краіна, кожнае выдавецтва, кожная ўстанова намагаліся падрыхтаваць сваю ўласную праграму.

Па словах начальніка ўпраўлення выдавецкай і паліграфічнай дзейнасці Міністэрства інфармацыі Уладзіміра Андрыевіча, цэнтральная экспазіцыя выстаўкі сімвалічна афармлена ў стылі агульнага дома. Гасцёўня аддадзена цэнтральнай пляцоўцы СНД, на якой наведвальнікі выставы знаёмяцца з экспазіцыяй кніг, уладальнікамі Гран-пры міжнароднага конкурсу "Мастацтва кнігі" СНД за ўсе 17 гадоў правядзення.

У "Кабінеце пісьменніка", дзе размесціліся лепшыя кнігі ўсіх краін Садружнасці па гісторыі, культуры, мастацтве праводзяцца сустрэчы пісьменнікаў з наведвальнікамі выстаўкі.

У "Дзіцячым пакоі" ёсць магчымасць не толькі ўбачыць літаратурныя навінкі, даведацца аб стварэнні кніг, але і цікава правесці час бацькам з дзецьмі.

Імправізаванай "Творчай кухні" адводзіцца роля азнаямлення наведвальнікаў з самымі новымі айчыннымі праектамі. Будуць прэзентаваны ўсе кнігі, якія выйшлі ў беларускіх выдавецтвах у

2020 годзе, а гэта каля 8200 найменаванняў. Наведвальнікі выстаўкі будуць мець магчымасць сустрэцца з аўтарамі, героямі кніг, акунуцца ў творчы працэс стварэння твораў.

Упершыню падчас выстаўкі быў праведзены літаратурны конкурс LitUP для пошуку і падтрымкі перспектыўных беларускіх аўтараў і праектаў па наступных намінацыях: паэзія, проза, дзіцячая літаратура, літаратура для падлеткаў, нон-фікшн. Аўтары, у выпадку прызнання іх пераможцамі, атрымаюць прыярытэтнае права на публікацыю сваёй кнігі ў адным з дзяржаўных выдавецтваў тыражом да 1 тысячы экзэмпляраў. Узнагароджанне пераможцаў адбудзецца 20 лютага аб 11-й гадзіне.

Адбыўся традыцыйны сімпозіум "Пісьменнік і час", тэма якога цесна звязана з дэвізам выстаўкі. "Слова мае вялікае значэнне і моцна ўздзейнічае на людзей. І мы хочам пачуць меркаванне літаратараў, грамадскіх дзеячаў пра ролю пісьменнікаў ва ўмовах сучасных міжнародных выклікаў і пагроз. Любы жадаючы можа падключыцца да сімпозіума анлайн і задаць удзельнікам сваё пытанне", — зазначыў Уладзімір Андрыевіч.

Намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена Стэльмах лічыць, што "вельмі важна, каб беларуская літаратура перакладалася на іншыя мовы". Праз кнігу народы пазнаюць беларускі характар і нашу культурную спадчыну. З гэтымі словамі, безумоўна, нельга не пагадзіцца.

Шырокі выхад "Кнігі ў людзі" мае працяг у тэатрах і кінатэатрах, на тэлеканалах, дзе ў дні работы кірмашу адбываюцца паказы фільмаў, спектакляў па творах вядомых пісьменнікаў Беларусі і іншых краін.

Ад станцыі "Няміга" да выставачнага комплексу ў дні выставы, па даўняй ужо традыцыі, ажыццяўляецца курсіраванне "Паэтычнага аўтобуса", у якім можна паслухаць па дарозе творы знакамітых аўтараў. Праезд у аўтобусе бясплатны, як і ўваход на сам кніжны форум.

ЛІТАРАТУРНЫЯ НАВІНКІ ЧАКАЮЦЬ ЧЫТАЧОЎ

На цэнтральнай пляцоўцы Нацыянальнага стэнда Беларусі Нацыянальная бібліятэка прадставіла свае праекты: "Новыя кнігі: па старонках беларускага друку" (да 60-годзя выдання), кнігі "Беларусь вачыма бібліёграфа", інтэрнэт-задума, прысвечаная да 120-годдзя Уладзіміра Дубоўкі і прэзентацыю анлайн-конкурсу чытачоў "О, Беларусь, мая шыпшына!"

Выдавецкі дом **"Звязда"** запланаваў штодзённае правядзенне імпрэзаў, частка якіх ужо адбылася: прэзентацыя кніг — "Іван Мележ. Пясняр Палесся", "Кандрат Крапіва. Шлях да неўміручасці", кнігі Ірыны Фраловай "Рамонкі на асфальце", Кацярыны Хадасевіч-Лісавой "Загадка прынцэсы Агнесы", Уладзіміра Ліхадзеева "Блакада" і "75 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне". Інеса Плескачэўская распавяла аб сваім вопыце міжнароднай работы, які адлюстраваны ў кнігах "Як разгадаць Кітай" і "Без жалезнай заслоны". На дзіцячай пляцоўцы адбыліся прэзентацыі кніг: "Першакрасавіцкі суп" Жаны Міус, "Кацяня Пых і шчанюк Прыг" Міхаіла Дзеравянкі і "Байкі ды казкі бабкі Параскі" Тацяны Атрошанка.У бібліятэцы імя Янкі Купалы па вуліцы В. Харужай, якая таксама часова ператварылася ў выставачную пляцоўку, адбылася прэзентацыя 6-й кнігі авантурна-прыгодніцкага цыкла Людмілы Рублеўскай "Авантуры Вырвіча, Лёдніка і Чорнай Меланхоліі".

А вось тыя імпрэзы, якія выдавецкі дом "Звязда" запланаваў на апошнія два дні выставы. 20 лютага на дзіцячай пляцоўцы ў 13:00 запланавана прэзентацыя кнігі Паўла Гушчынца "Прыгоды Букі Злюкі". Ірына Карнавуха распавядзе аб сваёй кнізе "У царстве свяшчэннага Байкала" ў 14:30, а ў 15:30 адбудзецца прэзентацыя адразу трох кніг Кацярыны Хадасевіч-Лісавой: "Палёт на Вухуцію", "Знаёмцеся — #Падабай.к@!", "Жахліўчык". А 21 лютага, ужо на галоўнай сцэне, у 13:00 адбудзецца прэзентацыя зборніка вершаў Леаніда Дранько-Майсюка "Скарб".

Безумоўна, колькасць запланаваных імпрэзаў не паддаецца ўліку і анансаваць іх усе мы не ў стане. Таму, каб не прапусціць цікавосткі, просім чытачоў "К" звярнуцца да адмысловых інфармацыйных рэсурсаў.

Але, не сумневаемся, што ўстаяць ад спакусы пакінуць на памяць нейкую кніжную навінку вам не ўдасца. Як не стрымаліся мы, набыўшы ў выдавецтва "Галіяфы" кнігу "Варта на Рэйне" Алеся Гародні (1899 — 1944), аповесць якога, з пэўнымі абмоўкамі можна было б параўнаць са славутым творам Яраслава Гашэка, у якім таксама галоўным персанажам з'яўляецца шараговец Першай сусветнай вайны Ёзаф Швэйк. Аб чым кажа ў прадмове літаратуразнаўца і паэт Віктар Жыбуль.

К

Па просьбах наведвальнікаў у гэтым годзе рэжым работы павялічаны на адну гадзіну: з 10.00 да 20.00, у апошні дзень — да 18.00. Для бяспекі ўведзены абавязковы масачны рэжым, пры ўваходзе будзе вымяраціца тэмпература, рэкамендавана выкарыстанне антысептыкаў.

“Кармічныя” партытуры дырыжора

Учора споўнілася 100 гадоў з дня нараджэння знакамітага дырыжора, народнага артыста СССР Яраслава Вашчака. Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Беларусі, дзе Яраслаў Антонавіч не толькі працаваў, але і пэўны час быў галоўным дырыжорам, адзначыў гэты юбілей паказам двух аднаактовых балетаў — “Кармэн-сюіты” і “Карміны Бураны”.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Фота з архіва тэатра

На сённяшні дзень у рэпертуары тэатра захоўваюцца чатыры спектаклі, дзе Яраслаў Вашчак выступаў дырыжорам-пастаноўшчыкам. Акрамя згаданых, гэта яшчэ “Балеро” і “Спартак”. Усе — з харэаграфіяй Валянціна Елізар’ева. У такіх балетных прыхільнасцях можна заўважыць біяграфічныя перазовы. Яго другая жонка Эмілія Шумілава была аўтарам буклета “Кармінь Бураны” і некаторых іншых харэаграфічных спектакляў тэатра. І зусім не “па блаце”: салістка балета ў Новасібірску, стваральніца і кіраўніца тамтэйшага харэаграфічнага вучылішча, кандыдат мастацтвазнаўства, яна была адным з першых выкладчыкаў, а пазней загадчыцай кафедрай БДУКіМ, напісала некалькі манаграфій, прысвечаных балетнаму мастацтву. Артыстка балета была і яго трэцяя жонка — Галіна Сідзельнікава, якая ў свой час выкладала ў нашым харэаграфічным каледжы і нават узначальвала яго як мастацкі кіраўнік. А ў даце 17 лютага, да якой была прымеркавана вечарына памяці з двума “кармічнымі” (абодва пачынаюцца на “карм-”) балетамі, таксама можна ўбачыць сімволіку: нашай нацыянальнай культуры Яраслаў Вашчак аддаў апошнія 17 гадоў свайго жыцця.

Нягледзячы на такую балетную славу, асабіста для мяне імя гэтага дырыжора найперш звязана з операй. І справа не ў тым, што яго апошнім спектаклем у нашым тэатры аказалася опера Уладзіміра Солтана “Дзікае паляванне караля Стаха”, якая да цяперашняга часу застаецца адным з сімвалаў беларускасці і нашай нацыянальнай культуры. І не ў тым, што менавіта за працу над гэтым творам у якасці дырыжора-пастаноўшчыка Я.Вашчак быў адзначаны Дзяржаўнай прэміяй Беларусі — ужо пасмяротна, бо не дажыў нават да прэм’еры ў 1989-м. А ў тым, што ён вельмі цаніў вакалістаў, бержаўліва ставіўся да голасу (дарэчы, спявачкай была яго першая жонка — народная артыстка Украіны, прафесар, загадчыца кафедрай сольных спеваў Адэскай музычнай акадэміі Галіна Паліванава, якая пайшла з жыцця літаральна два месяцы таму). І рабіў вялікі ўнёсак у папаўненне нашай трупы лепшымі маладымі галасамі, здольнымі ўпрыгожыць сусветныя сцэны. Пачуе на якім-небудзь конкурсе перспектыўнага опернага саліста — і запрашае ў наш тэатр. А ў настойлівасці, уменні пераконваць і, што называецца, “дацісканць” ён быў майстрам.

Ды ўсё ж галоўнае, мабыць, у тым, што спектаклі Яраслава Вашчака былі вельмі музычнымі — у самым высокім сэнсе гэтага слова. Ён не проста паказваў уступы, вытрымліваў тэмп, баланс гучання між аркестрам, хорам і салістамі, між асобнымі інструментальнымі групамі. Ён ператвараў зафіксаваны ў партытуры нотны тэкст — у музыку. І дасягаў той выразнасці, што дазваляе не толькі вылучыць прыгожыя мелодыі, іх тэмбравае, фактурнае “адзенне”, эмацыйны стан, але і праз усё гэта спасцігнуць змест, сэнс пачутага.

Музыка ў яго “дыхала”, жыла, размаўляла з намі, прычым праз сапраўдны дыялог. Бо кожная фраза знаходзіла водгук у душы слухача-гледача, абуджала пачуцці, фантазіі, думкі. Невыпадкова ён так зацікаўлена працаваў з беларускімі кампазітарамі, часам падказваў ім, як лепей адбудаваць оперную драматургію, дасягнуць неабходных гукавых эфектаў.

Шмат разоў гаварылася і пісалася пра тое, як скурпулёзна працаваў ён над партытурай “Дзікага паляванння караля Стаха” з маладым на тае часы Уладзімірам Солтанам. Кампазітарам тады “камандавалі” абсалютна ўсе — ад рэжысёра да салістаў, часам патрабаванні былі супрацьлеглымі. Дый рэагаваў ён на іх па-рознаму: на штосьці крыўдзіўся, з чымсьці пагаджаўся, дзесьці рабіў выгляд, што пагаджаўся, і працягваў па-свойму. А вось да прапаноў Яраслава Вашчака — прыслухоўваўся. І не таму, што дырыжор быў чалавекам бескампрамісным і, адстойваючы свой пункт гледжання, не цярпеў нязгоды. А таму, што тыя былі папраўдзе слушнымі. І тое тычылася не толькі “Дзікага паляванння...”

Такой жа дэталёвасцю суправаджаліся ранейшае засваенне новага беларускага рэпертуару: праца над балетам “Крылы памяці” Уладзіміра Кандрусевіча, операй “Джардана Бруна” Сяргея Картэса, якая ўвогуле вызначаецца не ўласцівым для тых часоў аратарыяльным ухілам. Памятаю і тое, якой моцы дасягалі ў Яраслава Вашчака кульмінацыі, і якімі пранікнёнымі маглі быць у яго лірычныя старонкі, і як па-рознаму гучала ў яго музыка таго ці іншага кампазітарскага стылю.

Ён адным з першых заклаў у беларускім оперным выканальніцтве традыцыі індывідуалізаванага дырыжорскага падыходу. Не проста “правільнага” і дасканалага, а пазначанага ўласнай аўтарскай канцэпцыяй. І тым быццам “прадказаў” сённяшні попыт на новыя арыгінальныя інтэрпрэтацыі.

Надпіс на адвароце карціны

Пад гісторыяй мастацтва звычайна разумеюць хроніку змены стылёвых і ідэйных прыярытэтаў у тым ці іншым сегменце культурніцкага абшару. Вось з гэтай прычыны асабіста я выставы персанальныя люблю больш чым групавыя. Бо ў межах персанальнай экспазіцыі творца раскрываецца шырэй і праўдзівей, чым ў кантэксе хору, дзе добрых галасоў шмат, але нікога канкрэтна не чуваць. Праўда, “сольны канцэрт” яшчэ трэба заслужыць... Але самае цікавае ў гісторыі мастацтва, як і ў гісторыі ўвогуле — чалавечыя лёсы. Нават скажу інакш: самае цікавае ў мастацтве — гэта самі мастакі.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ / Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Яўген Харытоненка. “У нас ва двары”.

У Нацыянальным мастацкім музеі апошнім часам адбылося некалькі персанальных выстаў, безумоўна, вартых глядацкай увагі. Пра прадстаўніка адной з іх (“Лёс мастака”) — Міхаіла Філіповіча — наша газета ўжо пісала. Пра творчасць славутых замежнікаў Лізу Сацціс і Джорджа дэ Кірыка распавядзем у бліжэйшы час. А зараз засяродзім увагу на Давідзе Якерсоне (1896 — 1947) — “Скульптура і графіка”, Яўгене Харытоненке (1920 — 1998) — “Да 100-годдзя з дня нараджэння”, Паўле Хадаровічы — “Мова рэчаў”, і Алеге Прусаве (1970 — 1996) — “Надпіс на адвароце”.

Першы — прадстаўнік эпахальнага для нашага краю рэгіёна і, бадай, усяго свету Віцебскага авангарда. Выстава прымеркаваная да 125-годдзя мастака. Другі — рэаліст самага што ні ёсць традыцыйнага кшталту. Ён увасабляе той кірунак, што панаваў у нашым выяўленчым мастацтве з 1930-х гадоў і да скону СССР. Хадаровіча (год нараджэння 1987) можна лічыць паслядоўнікам згаданай рэалістычнай традыцыі, які знайшоў сваё месца ў новым часе, дзе навацыі крыху пасунулі традыцыю з авансцэны. Сёння ягоная творчасць, засяроджаная на адным з самых дэмакратычных жанраў жывапісу — нашюрморце, запатрабаваная ў паспалітай грамады і ў гледачоў з падвышанымі эстэтычнымі запытамі. Прусаў — мастак, які пайшоў з жыцця, што называецца на ўзлёце, не паспеўшы рэалізаваць свой творчы патэнцыял, давесці да ладу, да канцэптуальнага выніку свае эксперыменты з формай і колерам. Тое, што чатыры мастакі, такія розныя лёсам і творчасцю, сабраліся у адзін час пад адным дахам — выпадковасць. Але для гледача гэта магчымасць адчуць, наколькі ёсць шматаблічнае наша мастацтва. І яшчэ зразумець: нішто нікуды не знікае, і нават пры дамінаванні нейкай адной плыні, другія таксама маюць сваю больш-менш дагледжаную дзялянку на культурніцкім полі. У 30-я гады, калі дырэктыўна ўсталёўваўся “сацыялістычны рэалізм”, увесь авангард, не толькі віцебскі, пахавалі і крыж на ім паставілі. Я не ведаю, чым займаўся Якерсон да свайго скону ў 1947 годзе. Хутчэй за ўсё ён быў адсунуты на перыферыю грамадскага жыцця і культурніцкай справы, жыў настальгічнымі ўспамінамі пра рамантычную маладосць. Яму пашчасціла значна меней, чым Марку Шагалу, які сваю настальгію зрабіў творчай канцэпцыяй, а канцэпцыю здолеў эфектыўна манетызаваць.

Давід Якерсон. Эскіз кампазіцыі “Пано з фігурай рабочага”.

Павел Хадаровіч. “Спякотны дзень”.

Давід Якерсон. “Тунгус”.

І вось колькі гадоў прайшло, і зноў у пашане віцебскія рэвалюцыянеры-рамантыкі. Цяпер той авангард — наш нацыянальны брэнд. Сёння опусы Давіда Якерсона, спрэчныя ў прафесійным сэнсе, але прывабныя сваёй наіўнай шчырасцю, патрэбныя нам для разумення і канкрэтнага часу, калі ў Віцебску рабілася нешта неверагоднае паводле рэалій і наступстваў ментальнага чынніку таго шляху, які прайшла Беларусь ў XX стагоддзі.

Пра такіх як Яўген Харытоненка кажуць, “зорак з неба не хапаў”. Адкрыццяў/вынаходніцтваў эпахальных і звычайных не рабіў, рызыкоўных творчых эксперыментаў не ставіў. Проста любіў рэчаіснасць такой, якая яна ёсць, і выдатна, майстэрску, як адлюстроўваў. Мог працаваць у якім заўгодна жанры, але засяродзіўся на партрэтным. Мяркуючы па тых творах майстра, якія я бачыў, маляваў ён звычайна тых, хто быў мастацтва на плоскасці ці ў аб’ёме. Распад СССР і “жалезнага занавесу” адкрыў шырокі шлях для інтэграцыі і глабалізацыі. З’явілася магчымасць свабодна, без унутранага кантролю ствараць што хочаш і як хочаш. Выраз “Усё, што мастак зрабіў — гэта мастацтва” часам успрымаецца апрыёры. Такія высновы жывуць, яны не сустракаюць сур’ёзных пярэчанняў. Маўляў, мы жывём у цэнтры Еўропы і мы не можам адставаць ад яе. На мой жа погляд, у культурным і этычным жыцці мы павінны заставацца беларусамі, несці і развіваць свае нацыянальныя асаблівасці.

Аднойчы і я напісаў твор у абстрактнай стылістыцы. Ён стаўся рэфлексіяй на аварыю на Чарнобыльскай АС. Той выбух парушыў звыклыя асновы жыцця, нябачная смяротная небяспека ў выглядзе радыяцыі рабіла нас іншапланецянамі на роднай зямлі. Гэты стан здранцвення-страху-невядомасці праявіўся ў маім творы дысгарманічнай кампазіцыяй, ненатуральным каларытам і лініяй. Але ж тым не менш мне падаецца, што эстэтыка рэалістычнага мастацтва — самая найлепшая і праўдзівая. Акварэльнаму жывапісу я прысвяціў больш за 60 гадоў свайго жыцця. Акварэль мне падуладная для стварэння і пейзажаў, і сюжэтных кампазіцый, і кампазіцыйных партрэтаў”...

Вось так горача, усхвалявана дзеліцца сваімі думкамі мастак. Побач — новая акварэль “Зімовая элегія”, напісаная нядаўна пад уражаннямі селетняй снежнай зімы.

Шматлікія публікацыі ў альбомах, кнігах, брашурах, часопісах, газетах сцвярджаюць, што жыве сярод нас таленавіты мастак, майстар, Рыцар Яе Вялікасці Акварэлі, прыгожы чалавек з вялікай душой і сэрцам, які ў сваіх творах замілавана і мужна, вельмі сардэчна і крана́льна апявае родную Беларусь, яе краявіды, славутых людзей гісторыі і культуры, — і гэтым бязмежна шчаслівы.

З пяшчотай і павагай трымаю ў руках невялікую сціплую кніжачку, альбом-манаграфію пра мастака аўтарства Таццяны Гаранскай, выдаленую выдавецтвам “Беларусь” у 1986 годзе, якую падарыў мастак на добры ўспамін. На вокладцы — “Бацькоўскі дом. Слуцкая мадонна”, адзін з лепшых твораў акварэліста. На ёй мы бачым на фоне раскрытага вясковага акна светлы воблік маладой жанчыны, што так кранальна туліць да сябе немаўля. Святло і цяпло мацярынскіх сэрцаў спрадвеку і сёння, і заўжды будзе мацаваць наша жыццё, натхняць творцаў на вышэйшыя ідэйныя высокадухоўныя мастацкія творы.

За актыўны ўдзел у мастацкім жыцці краіны Беларускі саюз мастакоў узнагародзіў Івана Пратасеню медалём “За дасягненні ў выяўленчым мастацтве”.

У сувязі з юбілеем хочацца пажадаць шаноўнаму Івану Міхайлавічу доўгіх гадоў жыцця і штодзённага бадзёрага дзі творчага настрою!

Святлана РАМАНАВА
Фота аўтара

Заканчэнне — на стар. 16

Пранізлівы голас яго акварэлі

Легендарная Стэфанія Міхайлаўна Станюта ў адным з інтэрв’ю прызналася, што “ніколі не адчувала ўзросту”. Гэтак жа — і Іван Міхайлавіч Пратасеня, тонкі лірык-мастак, страсна ўлюбёны ў акварэльныя фарбы, паліграфіст, былы мастацкі рэдактар Дзяржтэлерадыё БССР, іншых выдавецкіх установаў. Сваё доўгае жыццё ён прысвяціў услаўленню Радзімы і гераічных постацяў мінулага і сучаснасці. Ды і зараз, не зважаючы на шаноўны ўзрост, працягвае шчырую трапяткую размову з белым аркушам і капрызлівай акварэллю.

1 лютага Іван Пратасеня, чые творы знаходзяцца ў 18 музеях Беларусі і Расіі, а таксама ў шматлікіх прыватных калекцыях далёкага і блізкага замежжа, адзначыў свой 90-гадовы юбілей.

Напярэдадні свята мы сустрэліся з мастаком. Іван Міхайлавіч узгадаў сваё маленства на Случчыне, вёску Старцавічы (цяпер вёска Знамя), вучобу ў Мінскім мастацкім вучылішчы і Маскоўскім паліграфічным інстытуце, які скончыў у 1965 годзе. Урэшце, атрымаўся шчыры маналог творцы.

... “З самых малых гадоў праявілася мая здольнасць бачыць, здзіўляцца і адчуваць гармонію і прыгажосць у навакольнай прыродзе, у сямейным жыцці, — успамінае ён. — Маці і бацька былі цудоўнымі майстрамі. У хаце стаялі кросны, маці прыгожа ткала і вышывала, а бацька быў наогул майстрам на ўсе рукі. Свае вырабы любіў аздабляць дзівоснымі ўзорамі. Старэйшы брат Аляксей яшчэ вучнем намаляваў алоўкам для сельскага клуба копіі партрэтаў знакамітых дзеячаў, а бацька зрабіў адмысловыя рамкі. Гэта мяне так уразіла, што я пачаў маляваць усё, што мяне хвалявала. Потым быў нязменным афарміцелем школьных газет. Разам з настаўнікам матэматыкі Іванам Багушэвічам упрыгожвалі вясковую сямігодку да розных святаў.

Я з вялікай цікавасцю глядзеў, як Іван Цімафеевіч маляваў на цыратах дываны кляявымі фарбамі. Потым і сам пачаў капіраваць з часопіса “Огонёк” “Трох багатыроў” і “Алёнушку” Васняцова, “Паляўнічых на прывале” Пярова і іншых.

Не забыць мне і гады вучобы ў Мінскім мастацкім вучылішчы. Даўно гэта было, але з той пары, з 1950-х, захавалася некалькі маіх акварэльных работ, прысвечаных старому Мінску. Некалькі кампазицый нават былі надрукаваны ў газеце “Мінская праўда”. А адразу пасля заканчэння вучылішча зрабіў першае сваё афармленне кнігі паэзіі Дзмітрыя Кавалёва “Рабінавая ноч”. З таго часу і пайшло: Першыя маладзёжная і акварэльная выставы, шматлікія тэматычныя і юбілейныя экспазіцыі, прысвечаныя гісторыі нашай краіны, славутым постацям нацыянальнай культуры. Так у мяне нарадзіліся акварэлі “Жменя зямлі. Курган Славы”, “Раніца ў Хатыні”, “Нафтавікі Палесся”, “Будаўніцтва воднай сістэмы “Вілія і Свіслач”, “Ляўкоўскі бераг Дняпра”, “Хата Я. Купалы ў Вязынцы”, “Родны кут Я. Коласа ў Акінчыцах”, “Вяселле ў Падгор’ї” і іншыя.

Іван Пратасеня. “Рэха”.

“Набат. 1863. Кастусь Каліноўскі і Марыся”.

Усё творчае жыццё актыўна ўдзельнічаў у розных выставах, аж да юбілейнай — у Палацы мастацтва, прысвечанай 75-годдзю Вялікай Перамогі, на якой я прадставіў шматфігурную кампазицыю “Памінальная малітва”. На пярэднім плане размешчаны вобраз маёй маці. Яе сын Міхаіл, мой брат, не вярнуўся з франтоў Вялікай Айчыннай. Жанчыны моляцца пад высокім небам, звяртаючыся да нябёсаў...

Вялікая Айчынная вайна пакінула балючы след у маім дзяцінстве. На вайне загінуў мой старэйшы брат, загінулі дзясяткі аднавяскоўцаў, брат маёй жонкі Уладзімір. Рэха вайны адгукнулася ў маіх творах рознымі праявамі ў кампазіцыйных і пластычных рашэннях. Боль успамінаў пра вайну не аднойчы натхняў мяне на творчыя рашэнні, сагрэтыя душой і сэрцам: “Аб перажытым. Партрэт бацькі”, “Партрэт маці”, “Маці. Прысвячаецца А. Ф. Купрыянавай і яе сынам”, “Паэт і вайна” ды іншыя. Кожная мая работа — споведзь перад сваім сумленнем, экзамен на званне мастака. Эстэтычным арыенцірам і маральным кодэксам для мяне заўсёды былі прыгажосць і праўда. Праўда — гэта тое, што адпавядае рэчаіснасці. Па словах Арсенія Таркоўскага, “мэта мастацтва — гэта праўда і ісціна, усё астатняе — гэта фальш і гульня”.

З вялікай удзячнасцю хачу ўзгадаць сваю працу ў выдавецтвах краіны, аслабліва ў “Беларускай Энцыклапедыі імя Петруся Броўкі”, дзе я працаваў пасля заканчэння Маскоўскага паліграфічнага інстытута. Гэта была невычэрпная крыніца майго духоўнага, інтэлектуальнага і эстэтычнага станаўлення. Надараліся шматлікія сустрэчы з выдатнымі дзеячамі, якія паўплывалі на мой светапогляд і ўзбагацілі творчы дыяпазон. У той час з’явілася мае работы, прысвечаныя слынным постацям Айчыны: “Кірыла Тураўскі”, “Слова да нашчадкаў. Еўфрасіння Полацкая”, “Кветкі Радзімы. Францыск Скарына”, “Набат. 1863. Кастусь Каліноўскі і Марыся”, “Максім Багдановіч і Зоська Верас у 1916 годзе”, “Думы Цёткі. Алаіза Пашкевіч”, “Кветкі Радзімы. Максім Багдановіч”, работы, прысвечаныя Я. Купалу, Я. Коласу, П. Броўку, В. Быкаву, У. Караткевічу... Скажу шчыра, я ганаруся тым, што ў шматлікіх публікацыях у рэспубліканскім друку мяне называюць беларускім мастаком. Хачу дадаць, што з’яўляюся і савецкім мастаком (да гэтага часу захоўваю пасведчанне сябра Саюза мастакоў СССР).

Пачуццё адказнасці перад асабістым сумленнем, перад будучыняй стрымліваюць мяне ад розных сумнеўных пошукаў, ад “новай эстэтыкі” беспрадметнага

КУЛЬТУРА
WWW.KIMPRESS.BY
№ 8 / 20 ЛЮТАГА 2021 г.

15 варыянтаў творчасці

Кажуць, жыццё развіваецца па спіралі. Вельмі хочацца ў гэта верыць. Як і ў тое, што рэгіянальная культура пойдзе далей і вернецца ў сваёй эвалюцыі да тых часін, калі заможныя гаспадаркі зноў возьмуць на баланс музычныя школы, клубы, будуць выплачваць заробак настаўнікам ДШМ і грашовую надбаўку ўдзельнікам самадзейнасці, возьмуць на сябе абавязак па кампенсацыі камандзіровачных выдаткаў для творчых калектываў і наладжванні брэндавых фестываляў. Помнікамі тым часінам застаюцца двухпавярховыя будыніны, дзе хапала месца для адміністрацыі сельскагаспадарчых арганізацый і сельсаветаў, дзе працавалі пошта, ФАП, клуб, бібліятэка, музычная школа. Не, я не за вяртанне СССР, я за тое, каб сельгаспрадпрыемствы не станавіліся банкрутамі, каб не паміралі вёскі, я — за вяртанне гонару ад таго, што ў дбайнага гаспадара — дбайныя хлебаробы і жывёлаводы, якія маюць талент не толькі нарошчваць эканоміку, але і ўмацоўваць традыцыю спеўнасці, суладнасці памкненняў ды дзеянняў. Я за тое, каб у нашай прыгожай неабсяжнай Беларусі запальвалася святло ва ўсіх без выключэння вокнах памянёных гмахаў, якія яшчэ можна адрадзіць. Колькасць вырашчанага хлеба і колькасць творчых гуртоў — паняцці раўназначныя і ўзаемазалежныя.

Яўген РАГІН

Я да чаго ўсё гэта? Вельмі не хочацца назіраць, як чэзне беларуская вёска з яе трвдыцыямі. Так, гімн ёй, колішняй, стварыў Іван Мележ. Расповед пра тое, як адзначаецца стагоддзе славутага пісьменніка, даслала даўняя наша аўтарка Валянціна Расошанка — галоўны бібліятэкар аддзела бібліятэчнага маркетынгу **Светлагорскай** раённай бібліятэкі. Вось што яна піша: *"8 лютага, у дзень нараджэння Івана Мележа, бібліятэкі раёна правялі літаратурную імпрэзу "Пісьменнік вялікага таленту і душэўнай шчодрасці". У дзіцячай раённай прайшла медыягутарка, у* **Сасноваборскай** *гарпасялковай школьнікі адправіліся ў віртуальную экскурсію па Мележаўскіх мясцінах, у тым ліку — у вёску* **Глінішча Хойніцкага** *раёна, дзе нарадзіўся пісьменнік. А цэнтральная раённая бібліятэка наладзіла вечарыну ў літаратурнай гасцёўні "Гармонія", якая адбылася ў фармаце праекта "Калейдаскоп бліскучых імёнаў". А яшчэ ў раённым цэнтры быў арганізаваны анлайн-буккросінг "Чытаем Мележа разам". Маштабным сталася і наступнае мерапрыемства, пра якое варта пагаварыць асобна. Дырэктар Светлагорскай раённай сеткі бібліятэк Вікторыя Бусел падключыла да справы калегу — дырэктара Хойніцкай раённай бібліятэкі Алену Мідзялоўскую. У выніку атрымаўся сумесны анлайн брэйн-рынг "Пісьменнік з зорнай вечнасці". У ім бралі ўдзел старшакласнікі Светлагорска і Хойнікаў, а таксама — маладыя спецыялісты, настаўнікі, работнікі культуры. Пытанні для каманд былі няпростыя. Да прыкладу: колькі варыянтаў назвы рамана "Людзі на балоце" было ў пісьменніка, калі ён прынёс яго ў часопіс "Полымя"?"* Сапраўды, а колькі? Валянціна Мікалаеўна распавяла па тэлефоне, што варыянтаў было аж 15! Сярод іх, зазначыла, былі і такія назвы: "Наступ на балоты", "Туманы над багнай"... У вёсцы Глінішча (У рамане — Глініччы) я быў некалькі разоў. Паказвалі мне месца, дзе была цагельня, дзе адбылася бойка паміж Васілём і Карчом. Запомніўся такі ўспамін вяскоўцаў: калі Іван Паўлавіч прыязджаў на радзіму ў шыкоўнай "Волзе", ён збіраў поўны салон дзятвы і вёз усіх у Мазыр па цукеркі. Хто ж забудзецца на такія шыкоўныя вандроўкі?! Любіў Мележ вёску ды вяскоўцаў. Любіў, даражыў і нам завяшчаў.

Свае нататкі бібліятэкар па сувязях з грамадскасцю аддзела бібліятэчнага маркетынгу **Астравецкай** раённай бібліятэкі Вольга Заянчкоўская назвала "Бібліятэка выхоўвае". Ці не таму ў нас вёскі чэзнуць, што бібліятэчнага выхавання не стае? *"Бібліятэка — цэнтр культуры,* — піша аўтарка. — *Менавіта гэтага прынцыпу прытрымліваецца супрацоўніца* **Мальскай** *бібліятэкі Анжэла Янкоўская. Працуе даўно, літаратурны густ сярод чытачоў стараецца прывіваць з маленства. Вось душа і ратуецца прыгожым ды разумным".* Лепей і не скажаш.

Пра выхаваўчыя мэты бібліятэчнай справы разважае і бібліятэкар **Алекшыцкай** сельскай бібліятэкі **Берастаўіцкага** раёна Зоя Хлебнікава. 12 лютага ва ўстанове прайшоў урок мужнасці і гераізму "Споведзь салдацкага сэрца", прысвечаны Дню памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў. У бібліятэцы сустрэліся ветэраны вайны ў Афганістане і школьнікі, паміж якімі ўзнік дыялог, які і стаў асновай сустрэчы. Аўтар сцвярджае, што не было пры гэтым фармалізму. Цудоўна, калі гэта так.

У чарговы раз з неабыякавымі нататкамі выступіў Канстанцін Карнялюк з **Віцебска**. Асноўная тэма — патрыятызм. *"Гэта наш нацыянальны здабытак,* — сцвярджае аўтар. — *Вялікі патрыятызм пачынаецца з малой радзімы, з сям'і, дзе ён спее, набіраючыся моцы".* Цяжка з гэтым спрачацца.

Вестка са **Свіслацкага** раёна. 14 лютага **Ханевіцкі** сельскі клуб арганізаваў калектыўны дзень адпачынку "Зімовыя забавы". Дзеці і дарослыя не ўпусцілі магчымасць нагуляцца ў снежкі ды выкачацца ў снежных гурбах.

Апошнія зімовыя тыдні з карысцю выкарыстоўваюць і на **Дзятлаўшчыне**. Загадчык аддзела метадычнай работы мясцовага Цэнтра культуры і народнай творчасці Марына Лукіянец распавяла пра снежны арт, які правялі на пляцоўцы ля **Казлоўшчынскага**, **Гезгалаўскага**, **Дварэцкага** Дамоў культуры, дзе са снегу былі выраблены самыя розныя казачныя персанажы.

Тэму зімовых гульняў працягвае бібліятэкар з **Жодзіна** і ўдзельнік народнага аматарскага калектыву "Натхненне" Ірына Хілюціч. Свае прэм'ерныя выступленні самадзейныя творчыя калектывы вырашылі аб'яднаць падчас мерапрыемства "Зімовыя ўзоры". Выступілі народны ансамбль народнай песні "У коле сяброў", вакальны гурт "Весялінка", танцавальны калектыў "Натхненне".

Нізку навін даслала метадыст **Смаргонскага** раённага Цэнтра культуры Вольга Крывянкова. Яна распавядае, што кожны год, са студзеня па сакавік, ва ўстановах культуры Смаргоншчыны ладзіцца раённы агляд-конкурс па ўсіх відах і жанрах аматарскай мастацкай творчасці. Канцэрты ўжо адбыліся ў **Вішнеўскім**, **Залескім** ДК, **Льлойцінскім** сельскім клубе... У сацыяльных сетках і на сайце Смаргонскага раённага Цэнтра культуры стартаваў відэапраект фолькпадарожжа "Мінулае побач", распрацаваны работнікамі **Лешчаняцкага** сельскага клуба. Першым відэасюжэтам стала знаёмства з этнаграфічным пакоем сельскага клуба. Запіс другога адбыўся ў вёсцы **Абрамаўшчына**, дзе пражывае таленавіты музыкант-самавук Франц Гакуць... Цікавы відэасюжэт да Дня сустрэчы выпускнікоў падрыхтавала рэжысёр Залескага Дома культуры Аксана Ліс. Пасля школьнага выпуску адбылося аж 30 гадоў.

Навіна з **Лідскай** дзіцячай мастацкай школы. Тамтэйшыя юныя мастакі і навучэнцы мастацкай школы Калінінграда сябруюць ужо шмат гадоў. Днямі лідскія вучні ўдзельнічалі ў міжнародным конкурсе "Мы малюем Каляды", які ладзіўся ў Калінінградзе. Ксенія Казлоўская атрымала дыплом першай ступені. Дыпломамі другой ступені ўзнагароджаны Максім Гяльвей, Надзея Лоўкіс, Валерыя Пекар, Соф'я Руковіч, Яна Русіновіч. Дар'я Марцінкевіч адзначана дыпломам трэцяй ступені.

"У гарадской бібліятэцы **Ашмян** *экспануецца кніжная выстава, прымеркаваная да 680-годдзя з часу першай згадкі ў літаратурных крыніцах,* — распавядае загадчык установы Людміла Зарэцкая. — *Мяркуецца, што выстава будзе працаваць цягам усяго года з перыядычным папаўненнем і аднаўленнем дакументаў".*

Напрыканцы сённяшняга агляду спецыяліст Савецкага раённага аддзела надзвычайных сітуацый **Мінска** Таццяна Бычанок распавядае, што з 18 студзеня па 19 лютага праходзіла рэспубліканская прафілактычная акцыя "Бяспеку — у кожны дом!" Аўтар нагадвае, што асноўнай прычынай надзвычайных сітуацый застаецца неасцярожнае абыходжанне з агнём. Па гэтай прычыне штогод у краіне гіне каля тысячы чалавек. Чарговая небяспека, што ўзнікае па прычыне тэмпературных перападаў — ледзяшы. Памятайце, што небяспечныя ўчасткі на ходніках пазначаны агароджамі, заходзіць за іх нельга.

Беражыце сябе, шаноўныя!

Пішыце пра цікавае. Сустрэнемся праз тыдзень.

К

На здымках:
1 Падчас заняткаў у Лідскай дзіцячай мастацкай школе.
2 Калектыўны дзень адпачынку "Зімовыя забавы" ў Ханевічах.
3 Снежны арт па-дзятлаўску.
4 Літаратурная імпрэза ў Светлагорску, прысвечаная Івану Мележу.
5 Таленавіты музыкант-самавук Франц Гакуць.

16 лютага, у дзень народзінаў сусветна вядомага музыканта Чэслава Немэна, "К" пабывала на яго малой радзіме, у вёсцы Старыя Васілішкі, што на Шчучыншчыне. У гэты святочны дзень землякоў Чэслава Немэна і гасцей з іншых рэгіёнаў Беларусі чакала насычаная культурная праграма, падрыхтаваная Шчучынскім раённым Цэнтрам культуры.

Зміцер ЮРКЕВІЧ,
Мінск — Шчучынскі раён — Мінск /
Фота аўтара

На Шчучыншчыну, да Чэслава Немэна

ДРУГОЕ ЗНАЁМСТВА

...У Шчучыне я быў сустрэты вядучым метадыстам раённага Цэнтра культуры і народнай творчасці спадарыняй Галінай Петушок. І ўжо адтуль, на аўтобусе Шчучынскага Цэнтра культуры, разам з арганізатарамі, удзельнікамі і жадаючымі папрысутнічаць на свяце, мы прыехалі ў Старыя Васілішкі (да якіх ад Шчучына ўсяго чатырнаццаць кіламетраў). Дарога ішла заснежанымі палямі, праз вёскі са старымі, магчыма стогадовымі хатамі, таму размова са спадарыняй Галінай, сама сабой, ад праграмы імпрэзы перайшла на гісторыю гэтых мясцінаў. Сюды вельмі захацелася абавязкова вярнуцца, можа, як пацяплее...

Першай кропкай нашага маршруту стаў падворак дома-музея Чэслава Немэна. Пакуль арганізатары рыхтаваліся да важнай часткі праграмы (адкрыцця мемарыяльных дошак), у мяне быў час агледзецца. Ці думаў я, што аднойчы, па пояс ў снезе, у моцныя маразы, буду сустракаць дзень народзінаў Немэна ў двары хаты, дзе ён прыйшоў на свет і адкуль назаўжды з'ехаў на чужыну? Вядома ж, не. Але я быў тут. Я быў сярод людзей, якія шануюць памяць пра музыканта, ганарацца тым, што ён наш зямляк. Гэта было кранальна.

Спадарыня Галіна пазнаёміла мяне з дырэктарам дома-музея спадаром Уладзімірам Сенютам, які загадзя парупіўся, каб у звычайнай сялянскай хаце было цёпла і ўтульна. Быў час пазнаёміцца і паразмаўляць таксама і з прадстаўнікамі апякунскай рады дома-музея, якія адмыслова з Мінска прыехалі ў гэты дзень. На вялікі жаль, гэтым разам з імі не было спадарыні Веры Савінай, якая вельмі шмат высілкаў прыклала да з'яўлення гэтага музея і папулярызацыі імя Чэслава Немэна ў Беларусі.

Дзіўны лёс гэтага музея. Хата, пабудаваная больш за сто гадоў таму дзедам Чэслава Якубам Выдрыцкім, як і іншыя васілішкаўскія хаты, нейкім цудам перастаяла Першую і Другую сусветныя войны, прайшла праз розныя рукі, пабывала вясковай крамай і пазнала нават занепад... і раптам стала адзіным у свеце жывым музеем Чэслава Немэна. І паспрыяла гэтаму ў пэўным сэнсе смерць музыканта. Калі б не яна і тая новая, шырокая хваля цікавасці да асобы таленавітага старавасілішкаўца, хату, якая сваім занядбаным выглядам псавала мінакам настрой, маглі б і не пашкадаваць. Але не невядомы чараўнік з кійком прыйшоў на дапамогу сядзібе — жывыя людзі-беларусы. Стварэнню музея папярэднічалі цягам пэўнага часу ліставанне, неабходныя сустрэчы, публікацыі. І вось 16 лютага 2010 года адбылося ўрачыстае адкрыццё музея. Паступова, у трох пакойчыках сфармілавалася экспазіцыйная прастора, якую запоўнілі фотаздымкі, творы мастацтва, кнігі, памятныя медалі. З'явілася і фартэпіяна, прывезенае саветам апекі з Мінска.

Разглядаючы фотаздымкі, я ледзь не прапусціў закліч на экскурсію ў касцёл, які быў першым важным пунктам святочнай праграмы.

КАСЦЁЛ СВЯТЫХ ПЯТРА І ПАЎЛА

Недзе гадоў 500 таму ў Старых Васілішках быў пабудаваны першы касцёл. Праз нейкі час ён згарэў, але па загаду каралевы Боны Сфорцы быў адноўлены. Стары драўляны касцёл разабралі напрыканцы XIX стагоддзя, каб на яго месцы пабудаваць "сучасны" храм (1905). Цікавых адметнасцяў ад падобных неагатычных храмаў у ім нямала. Першае, што кідаецца ў вочы, гэта тое, што на гранітных камянях падмурка і аркі ўвахода выбіты імёны асоб, якія ахвяравалі на ўзвядзенне касцёла. Праўда, яны з нейкай прычыны замазаны цэментам. Але ж варта было б іх раскрыць. Па-другое, клопатам Зыгмунта і Марыі Дэмбінскіх, з левага боку ад алтарнай часткі пабудаваны ўнікальны грот, унутры якога захаваліся фрэскі 1908 года. Ёсць і іншае, што варта ўбачыць. Напрыклад, арган мяжы XVIII — XIX стагоддзяў, які рамантаваў бацька Немэна Антон Выдрыцкі. Арган, які да нядаўняга часу быў у жахлівым стане, у 2017 годзе быў адноўлены.

У гэтым касцёле ў 1939 годзе і быў ахрышчаны Чэслаў Выдрыцкі. Тут жа пасля вайны спяваў у хоры. Аб сувязі Немэна і гэтай святыні нагадвае чорная мармуровая дошка, замацаваная на адной з калон касцёла. А сёння, у дзень нараджэння музыканта, яшчэ і адмысловы памятны стэнд. Пасля экскурсіі па касцёлу мы вярнуліся на падворак Выдрыцкіх.

ПАМЯТНЫ КАМЕНЬ

На апошнім здымку, які быў зроблены падчас канчатковага развітання з радзімай, Чэслаў Немэн сфатаграфаваны на вялізарным валуне. Раней, месціўся ён на беразе маляўнічай рачулкі Лябёдкі, якую ў часы празмернага савецкага захаплення меліярацыяй бязлітасна спрамілі, ператварыўшы ў звычайную канаву. Той чароўны куток, куток дзіцячых і юнацкіх мар быў, на жаль, назаўжды знішчаны. Цяпер гэты камень клопатам сям'і Антона Федзюковіча і Тамары Аўтуховіч займеў новае месца на дзядзінцы сядзібы. Яны ж падрыхтавалі дзве пліты з чорнага мармуру, на адным з якіх змешчана выява Чэслава Немэна, а на другім выгравіраваны кароткі вершык педагога і паэтэсы са Шчучына спадарыні Галіны Беляўскай.

"На камень сеўшы,
бы ў дзяцінстве
У дзверы памяці пастукаў...
Сваё з Радзімаю адзінства
Ён прыгадаў у мроях гукаў..."

Пасля ўрачыстага адкрыцця памятных дошак перад сабранымі выступілі з кароткімі прамовамі ўдзельнікі імпрэзы — спадары Антон Федзюковіч, Аляксандар Нілаў, Уладзімір Сенюта і аўтар вершаванага прысвячэння Галіна Беляўская.

Трошкі падзамёрзлыя мы ізноў вярнуліся ў музей. Яго дырэктар спадар Уладзімір Сенюта цалкам завалодаў увагай наведвальнікаў. Слухаў з захапленнем прамову і я. Дарэчы, даведаўся шмат новага, бо за гады існавання музея ў ім пабывала вялікая колькасць "немэназнаўцаў", якія падзяліліся цікавымі звесткамі. Асабліва ўразіла апавяданне пра кліматычныя з'явы ў дзень пахавання музыканта на варшаўскіх Паванзках. Дарэчы, пару гадоў таму паставіў ля магілаў Чэслава Немана і Станіслава Манюшкі пару сваіх знічак і я, таму магу засведчыць, што словы пра культавасць магілы Немэна — факт.

АД ЗЕМЛЯКОЎ

Завяршальная частка праграмы адбылася ўжо ў Цэнтры культуры аграгарадка Васілішкі, ад якога да вёскі Ст. Васілішкі каля двух кіламетраў.

Пакуль у актавай зале збіраліся ўдзельнікі, гледачам была паказана дакументальная стужка "*Гэты дзіўны свет...*", знятая ў 2009 годзе Верай Савінай у суаўтарстве з Аляксандрам Нілавым. Перш чым распачалася абяцаная канцэртная праграма, з прамовамі пра Чэслава Немэна выступілі спадары Антон Федзюковіч, Уладзімір Сенюта, а таксама і аўтар гэтых радкоў.

Пасля чаго адбылося ўрачыстае ўзнагароджанне памятнымі падарункамі асоб, якія адзначыліся на ніве папулярызацыі асобы Чэслава Немэна і шматгадовай падтрымкай музея — Веры Савінай, Анатоля Федзюковіча і Тамары Аўтуховіч, Алы Бібікавай, Сяргея Касперчука, Аляксандра Кунцэвіча, Вячаслава Бруйка, Аляксандра Смірнова і дырэктара музея Уладзіміра Сянюты. Ад імя Шчучынскага райвыканкама падарункі ўручыла галоўны спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі спадарыня Кацярына Дзенуць.

Напрыканцы імпрэзы ў выкананні маладых спявачак Таццяны Шэршань і Веранікі Шырокай прагучалі спевы Чэслава Немэна. Фінальную ж кропку паставіў народны ансамбль песні "Васільковая раніца" з канцэртнай праграмай "Яшчэ не раз вы ўзгадаеце мяне".

На пасткрыптум мерапрыемства адбыліся дыскусіі ў кулуарах, калі за кубкам кавы ці гарбаты вяліся размовы пра Чэслава Немэна, пра развіццё і праблемы музея. Думаю, што больш сур'ёзная спонсарская дапамога Дому-музею і зараз не была б на шкоду.

Перад ад'ездам у Шчучын хапіла часу і на тое, каб прайсціся па цэнтральнай Савецкай вуліцы мястэчка да барочнага касцёла Яна Хрысціцеля 1769 года пабудовы. Цікава, што на гэтай вуліцы захавалася даволі шмат драўляных і каменных дамкоў месцічаў, пабудаваных, як мне падалося на першы погляд, яшчэ "да 1917 года".

ПААБЯЦАЎ ВЯРНУЦЦА

Каб адзначыць камандзіроўку завітаў я і ў Шчучынскі раённы Цэнтр культуры і народнай творчасці, дзе пазнаёміўся з яго дырэктарам спадарыняй Святланай Жвірбля. Падчас размовы я даведаўся пра планы Цэнтра на 2021 год, а таксама падзяліўся сваімі думкамі і прапановамі.

Ужо ў маршрутцы, усё яшчэ пад натхненнем ад цудоўнай імпрэзы і ветлівай цеплыні шчучынцаў, я занатаваў на памяць, што паабяцаў перадаць для фондаў музея Чэслава Немэна сведчанні праведзеных намі ў 2009 — 2014 гадах папулярызатарскіх "немэнаўскіх" вечарынаў і фестываляў.

Улічваючы ўсё гэта, я вельмі спадзяюся, што на Шчучыншчыне я пабываю яшчэ не раз. І яшчэ не раз будзе пра што распавесці чытачам "К".

К

Казачнае царства маляванак Віцебскага Паазер'я

Маляваныя дываны — унікальная беларуская традыцыя з XX стагоддзя. Амаль забытая, пакрысе яна адраджаецца — маляванкі лепшых мастакоў мінулага захоўваюцца ў музеях, імёны Алены Кіш і Язэпа Драздовіча цяпер ведаюць усе адукаваныя людзі. Але жыве традыцыя тады, калі ёсць сучасныя творцы і сучасныя творы. 17 лютага ў Мінску ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры адкрылася вялікая выстава "Чароўных слоў увасабленне. Легенды, паданні і казкі Віцебшчыны ў маляваных дыванах". Такога ў сталіцы Беларусі раней не было — 21 майстар з Віцебскай вобласці прадстаўляе свае яскравыя, казачныя маляванкі. І гэта трэба бачыць. Выстава будзе ісці цягам двух месяцаў.

"Глыбокае". Аўтар — Святлана Скавырка (Глыбокае).

Надзея КУДРЭЙКА

Віцебскае Паазер'е — захад Віцебскай вобласці — адно з тых месцаў, дзе маляванкі на Беларусі мелі найбольшае распаўсюджанне і вызначаліся адметнымі мастацкімі рысамі. Там жа, на Дзісеншчыне, яшчэ ў 30-х гадах мінулага стагоддзя іх стварыў і Язэп Драздовіч — мастак, пісьменнік, этнограф. У 2014-м традыцыйнае мастацтва маляваных дываноў Віцебскага Паазер'я атрымала ў Беларусі статус нематэрыяльнай культурнай каштоўнасці. З Віцебшчыны — з Докшыцаў — і знакаміты беларускі мастак Віктар Маркавец: разам з калегамі яны зрабілі вялікі ўнёсак у справу адраджэння мастацтва маляванак, і самі стварылі цэлы іх шэраг. Маляваныя дываны маюць даўнюю гісторыю, яшчэ з канца XIX стагоддзя — як працяг цэхавай традыцыі малярскага мастацтва і як частка такой значнай для Віцебшчыны з'явы, як інсітнае мастацтва.

Таму вялікая выстава сучасных творцаў менавіта з Віцебскага Паазер'я невыпадковая — яна з сэрца гэтай традыцыі. І з таго месца, якое ў Беларусі ледзь не адзінае, дзе мастацтва маляванкі працягвае жыць як масавая з'ява. Прынамсі, зараз мы кажам пра некалькі дзясяткаў майстроў, якія прадставілі свае работы на выставу. Некаторыя з іх гэтае мастацтва пераймалі яшчэ ад знаных творцаў мінулага стагоддзя. Напрыклад, Святлана Скавырка з Глыбокага вучылася ў Галіны Таляронак, тая — у Фёдара Сухавілы, аднаго з самых славутых беларускіх майстроў, таксама з Глыбоччыны. А Фёдар Сухавіла меў магчымасць на свае вочы назіраць за працай самога Язэпа Драздовіча. Насамрэч, пераемнасць. Дарэчы, цягам двух месяцаў, што выстава будзе ісці, плануецца правесці і шэраг майстар-класаў па маляванцы. Гэтая інфармацыя сапраўды можа зацікавіць многіх.

На ўрачыстым адкрыцці экспазіцыі 17 лютага

Куратар выставы Ірына Князева прадстаўляе экспанаты.

вядомы мастацтвазнаўца, загадчык кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва БДУКіМ Рыгор Шаура назваў выставу сапраўднай падзеяй у нашай нацыянальнай культуры і падзякаваў спецыялістам з Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці, чыімі намаганнямі мастацтва маляванкі так паспяхова адраджаецца — дырэктару Кацярыне Лабука, вядучаму метадысту Людміле Вакар, усім майстрам. Старшыня Беларускага саюза майстроў народнай творчасці Яўген Сахута, найзнакамітейшы мастацтвазнаўца і этнолаг, таксама адзначыў унікальнасць гэтай з'явы — віцебскага мастацтва — і праведзеную вялікую працу:

— Яшчэ гадоў 35 таму пра маляваныя дываны Паазер'я амаль ніхто не ведаў. І я хачу падзякаваць віцебскім энтузіястам. Гэта яны ператварылі край, спалены вайной, у край народных талентаў. Я добра памятаю, як даўно ўжо, раней, калі гаворка заходзіла пра збіранне выстаў народнай творчасці, то пра Віцебшчыну казалі — там нічога няма, усё вайна знішчыла. А потым аказалася, што Віцебская вобласць выйшла на перадавыя пазіцыі ў народнай творчасці, гэты край аказаўся самы багаты на народных майстроў. І маляваныя дываны Паазер'я цяпер сапраўдная з'ява — са сваёй мастацкай мовай, са сваімі аўтарскімі набыткамі. І ўсё дзякуючы энтузіязму і таленту руплівых мясцовых людзей.

У 60-я гады мінулага стагоддзя развіццё гэтага віду народнай творчасці было амаль прымусова спынена, калі ўсіх рамеснікаў абклалі падаткамі. Але ў Віцебскай вобласці традыцыя маляванак да канца і не перарывалася: хоць і некалькі майстроў, але працягвалі працаваць. Ужо ў другой палове 80-х Віцебскі метадычны цэнтр арганізаваў у райцэнтрах семінары па маляванках, у Віцебску, Полацку, Мінску і Смаленску прайшлі выставы "Краскі Паазер'я", прысвечаныя 100-годдзю Язэпа Драздовіча, апошнія 20 гадоў і выставы, і святы-конкурсы адбываюцца хоць і нячаста, але пастаянна. І маюць яны, дарэчы, паэтычныя назвы, адпаведныя ідылічнай сутнасці маляванак, — напрыклад, "Райскі сад". А свята-конкурс, што праходзіць у межах фестывалю "Славянскі базар у Віцебску", называецца "Фарбы нябёсаў".

І ўсё роўна, мастацтва гэтае застаецца штучнай, рэдкай з'явай. Тым больш каштоўная выстава "Чароўных слоў увасабленне...", што адкрылася ў Музеі гісторыі беларускай літаратуры: 40 маляваных дываноў! На бліжэйшыя два месяцы некалькі выставачных залаў музея ператвараюцца ў нейкі казачны сусвет, наведнік быццам трапляе ў чароўнае царства. Прычым царства Віцебскага Паазер'я: усе выявы, усе творы нахтнёныя легендамі і паданнямі гэтага краю, у значнай ступені — паданнямі пра паходжанне гарадоў і вёсак. Русалкі і цмокі, жыватворныя крыніцы і райскія сады, абавязкова блакітныя азёры, якімі славіцца Віцебшчына, — усё гэта на маляваных дыванах. Водная стыхія ўвогуле — адзін з устойлівых вобразаў дыванковых пейзажаў віцебскіх мясцін. Такім чынам злучаецца і слова, літаратура, — музей жа гісторыі беларускай літаратуры — і выяўленчае мастацтва.

Прыгожая сама канцэпцыя выставы. Падзеі, што прывялі да яе адкрыцця, склаліся адна за адной. Год таму ў Музеі гісторыі беларускай літаратуры праходзіла выстава, прысвечаная Васілю Кораню і яго першай гравіраванай Бібліі для народа ў малюнках канца XVII стагоддзя. Васіль Корань быў родам з Дуброўна, яго маляваная Біблія расказвала народу, на тые часы малапісьменнаму, біблейскія гісторыі праз карцінкі. Прыкладна тады ж новым супрацоўнікам музея стала Ірына Князева — куратар цяперашняй выставы і, між іншым, сама аўтар маляваных дываноў, якая да таго пэўны час працавала якраз у Віцебскім АМЦНТ. Разам з тагачасным дырэктарам музея Міхаілам Рыбаковым — а ён ізноў жа родам з Дуброўна! — яны распрацавалі цікавую ідэю, як сумясціць маляванкі і беларускае слова і як папоўніць музейны праект "Рэгіёны" яшчэ адным цікавым мерапрыемствам. Легенды, паданні — гэта таксама мастацтва слова, гэта літаратура, гэта гісторыя літаратуры. Маляванкі — як маляваная гісторыя, як метафара, народжаная фальклорнай першакрыніцай. І большая частка маляваных дываноў, прадстаўленых на выставе, стваралася менавіта пад канцэпцыю: майстрам Віцебшчыны было прапанавана звярнуцца да сваіх мясцовых легенд і паданняў. Такім чынам, амаль усе гэтыя работы — новага часу, зусім нядаўнія, ёсць нават ужо 21-га года. Прадстаўлены 14 раёнаў Віцебшчыны — не па ўсёй вобласці гэтае мастацтва было распаўсюджана. Па выніку

"Стаўры і Гаўры". Аўтар — Таццяна Шынкарова (Орша).

"Паставы — паселішча ля ставаў". Аўтар — Вольга Гукава (Паставы).

"Райскі сад". Аўтар — Жанна Ільюшкіна (Лёзна).

больш за ўсё атрымалася маляванак з Лёзна.

Некалькі слоў пра тое, што такое маляванкі: у цэнтры ільнянога палатна, пафарбаванага ў чорны колер, малюецца карціна і бярэцца ў дэкаратыўнае акаймленне. Атрымліваецца як звычайны дыван, толькі маляваны. Просты народ не мог дазволіць сабе сапраўдныя дарагія дываны, а маляваныя прызначаліся для ўпрыгожання пакояў, і вешаліся, як правіла, на сцяну над ложкам. Яны нават уваходзілі ў пасаг маладой дзяўчыны і часта спраўляліся перад вяселлем. Былі і вялікія дываны, былі і столачкі, альбо паўдываны, і яшчэ меншыя. Раней для малявання карысталіся анілінавымі фарбамі, у якія дадавалі сталярны клей, зубны парашок, крэйду. Раслінныя ўзоры "набівалі" пры дапамозе трафарэтаў і штампаў — а штампамі маглі быць і бульбіна, і рэпка, і многае іншае. Вольным роспісам пэндзлем валодалі толькі рамеснікі-маляры — мастакі-аматары, цэнтральны сюжэт яны менавіта малявалі. У наш час мастакі працуюць ужо ў асноўным з акрылавымі фарбамі, у іх малюнках ужо больш розных тэм і стыляў — ёсць і мадэрн, і нават абстракцыянізм. Але прынцып дывана — дэкаратыўнае афармленне па контуры, у цэнтры карціна, і агульная паэтыка ідылічнага свету з метафарамі раю — усё той жа.

Побач з кожным выстаўленым маляваным дыванам на стылізаваным аркушы можна прачытаць само тое паданне ці легенду, якое натхніла на карціну. 40 маляванак — 40 гісторый. Адкрываецца выстава яшчэ ў фае — работамі майстроў з Лёзна Жанны Ільюшкінай і Ірыны Церашковай, якія працуюць з дыванамі даўно і працуюць менавіта як мастакі. Вось, напрыклад, адзін з дываноў Жанны Ільюшкінай "Цудоўная крыніца" заснаваны на паданні пра тое, як у Лёзненскім раёне ўтварыліся крыніцы, — а сваімі крыніцамі месцічы вельмі ганарацца, многа крыніц — многа і розных паданняў. Адно з іх пра балота, на якім стаяў забыты калодзеж, а потым з яго забіла чыстая крыніца і ператварыла гэты край у прыгожы і багаты. Дываны Ірыны Церашковай звернутыя да жаночых вобразаў з паданняў і фальклору, на іх — русалкі, зоры-зараніцы, варажэі.

Увогуле, большасць маляванак натхнёныя тапанімічнымі паданнямі: такім чынам на адной выставе можна не толькі мастацкімі творамі палюбавацца, але і даведацца пра гісторыю мясцін Віцебшчыны. Святлана Скавырка з Глыбокага — знаны народны майстар і дырэктар Глыбоцкага Дома рамёстваў — гісторыі стварэння горада прысвяціла вялікі дыптых. Было возера Глыбокае, а потым там жа утварылася і паселішча. На яе маляванцы выяўлены розныя значныя месцы горада і, канешне, самое возера. Нямала маляванак і з Лепеля — усе яны звязаныя з тапанімічнымі паданнямі, на карціне Аляксея Краўчанкі — знакаміты лепельскі цмок. Ірына Качынская з Ушачаў паказвае "Легенду пра Ушачы". Вольга Аляксеева з Дуброўна ў рабоце "Добрасуседства" выкарыстала ўжо даволі сучасную гісторыю. Дуброўна ж — цэнтр ганчарства, і праз дарогу жылі два вядомыя на Дубровеншчыне ганчары. У жанчыны-майстра не было ўласнага горна, і абпальваць свае знакамітыя гліняныя свістулькі яна хадзіла да суседа. У цэнтры маляванкі — два гэтыя ганчары, што трымаюць у руках гліняныя свістулькі. Тацяна Даўлетшына, дырэктар віцебскага Цэнтра рамёстваў "Адраджэнне", захопленная даследаваннямі Мікалая Нікіфароўскага пра нячысцікаў, скарысталася легендай пра русалак, якія, выходзячы на сушу, вадой са сваіх валасоў маглі затапіць цэлую вёску.

Пра ўсе 40 гісторый тут не раскажаш, згадаю хіба што дываны, натхнёныя літаратурнымі творамі. Ірына Князева звярнулася да казкі Уладзіміра Караткевіча "Аўтух-дамоўнік" — і ён намаляваны на кані, голы, як і пісаў Караткевіч. А паводле верша Максіма Багдановіча "Русалка" стварыла маляванку Тацяна Лапкова з Віцебска. Завяршае выставу вельмі адметная работа, створаная куратарам Ірынай Князевай паводле эскіза Марка Шагала "Двое за сталом". Абгрунтаванне такое: Марк Шагал — легенда Віцебска!

Але не толькі маляванкі можна ўбачыць на новай выставе. На вітрынах экспануюцца і адпаведныя кнігі з фондаў музея: разнастайныя зборнікі казак, "Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебшчына", кнігі "Міфа-паэтычныя матывы ў беларускай літаратуры", "Мікалай Якаўлевіч Нікіфароўскі", "Памятная кніжка Віцебскай губерніі", "Полацка-Віцебская мінуўшчына", і гэтак далей. Можна прадказаць, што выстава "Чароўных слоў увасабленне" стане даволі папулярнай у сталічных жыхароў. Бо — і калі яшчэ такое ўбачыш, і — хоць на час экскурсіі, але можна пабываць у прыгожым, ідылічным, маляўнічым казачным свеце.

К

Пачэсная прапіска твайго імя

З "залатога фонду" традыцыйнага мастацтва

Нарэшце ганараваныя майстры нашага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва атрымалі пачэсную прапіску свайго імя ў годным выданні "Народныя майстры Беларусі", якое падрыхтавана ў Рэспубліканскім цэнтры нацыянальных культур (складальнікі Я. М. Сахута, А. Ю. Лозка. Мінск: ІВЦ Мінфіна, 2020. 300 с.). Сюды патрапілі 140 умельцаў, якім спецыяльнай дзяржаўнай камісіяй прысвоены статус "народнага майстра" (на сённяшні дзень іх ужо 146).

Заслугоўваюць такой увагі, безумоўна, ужо нешматлікія (14) ганчары — майстры самага старажытнага рамяства, якое яшчэ ў канцы XIX — першай палове XX стагоддзяў на тэрыторыі Беларусі прадстаўлялася амаль трохсоценнымі ганчарнымі асяродкамі, а цяпер — адзіным (вёска Гарадная Столінскага раёна). Майстры-ганчары пераважна развіваюць мясцовыя традыцыі, захоўваючы і пашыраючы разнастайныя тэхнічныя прыёмы і сродкі: А. М. Басавец дэкаруе посуд апробным роспісам і палівай; М. Я. Шэлест — нацёкамі зеленаватай палівы (Столінскі раённ); В. І. Логвін працуе ў тэхніцы пружанскай чорнаглянцаванай керамікі (Брэст); В. Л. Шэлест — валодае майстэрствам розных глазураваных керамік (Ганцавічы); А. У. Мяцельскі — займаецца задымленнем і вырабам музычных інструментаў (Дзяржынск); М. В. Васкоўскі стварае керамічныя скульптуры, асабліва ў тэхніцы дымлення, вобразы якіх набываюць колер бліскучага металу (Мазыр); М. А. Насановіч дзейнічае ў мясцовай традыцыі дарасінскіх умельцаў ангобнага роспісу (Любань); Ю. І. Боўда - валодае рознымі жанрамі і прыёмамі (Бабруйск); В. М. Якавенка выробляе керамічную цацку (Крычаў), М. А. Пратасеня — цацкі-свістулькі, бразготкі і іншае (Салігорск); маюць свой стыль Н. С. Рагоўская (Хоцімск), І. К. Раманчук (Лагойск) і іншыя.

Творы мастацкага саломапляцення сталі своеасаблівым брэндам Беларусі. Дасканаласць майстэрства асобных прадстаўнікоў "залатой" галіны ўзносіць яе да феномена нацыянальнага набытку. Сапраўдныя шэдэўры ствараюць Л. М. Лось, Т. П. Агафоненка, Л. Р. Главацкая ў Мінску, М. В. Ермаловіч, В. Л. Рэут, Т. А. Худзякова на Віцебшчыне, Н. В. Дамянікава, А. І. Зушчык, І. Г. Кухціна, Н. І. Панцялеева, Г. Л. Салонінка на Магілёўшчыне, А. А. Аўсяннікава, Р. А. Раманеня на Міншчыне.

У Беларусі цуды з "залатой" саломкай не заканчваюцца, бо маецца яшчэ старадаўняя тэхніка спіральнага саломапляцення, на аснове якой нараджаюцца дзівосы калекцый посуду, галаўных убораў ды іншае. Тут яркімі прадстаўнікамі рамяства з'яўляюцца Н. Л. Ярмоцык (Бяроза), Л. Г. Гаравая (Віцебск), якіх ведаюць прэстыжныя выставы і музеі ў краінах замежжа. А ёсць яшчэ майстры аплікацыі і інкрустацыі саломкай (Г. А. Сцепанкова з Горак), у тым ліку аплікацыі саломкай па тканіне (М. А. Русаковіч са Старадарожчыны), вырабу лялек з ільну і саломкі (В. М. Сыцікава з Магілёва).

Побач з саломапляценнем добра развіваецца промысел з іншых прыродных матэрыялаў (лазы, сасновай дранкі). У лозапляценні выдатна заявілі пра сябе В. А. Валошчык (Брэстчына), А. М. Краўчук, У. К. Лук'янец, В. П. Сіманковіч з Віцебшчыны, Т. А. Самойленка з Гомеля, А. А. і Л. А. Мускія з са Смаргоні, С. М. Афонькін, Т. А. Багдановіч, Т. М. Фяськова, І. В. Хізанейшвілі з Магілёўшчыны, А. В. Гурэцкая, І. Е. Хацкевіч, У. А. Ціханоўскі з Міншчыны.

У лясной Беларусі мастацкая апрацоўка дрэва спрадвечная, традыцыйная. Пра гэта сведчаць раскопкі XI стагоддзя, розныя дакументальныя матэрыялы. Напрыклад, прадукцыя бондараў здаўна паспяхова экспарціравалася ў еўрапейскія краіны. Да нашага гонару працуе адзіная школа бондарства ў Іванаве. А сучасных бондараў у шэрагах "народных майстроў" толькі два: М. М. Кукса (Гродна) і У. І. Станкевіч (Глускі р-н). Традыцыйную нішу ўтылітарна-дэкаратыўнага промыслу займаюць лыжкаробы В. А. Расолаў (Гомель) і Я. П. Осіпаў (Бярэзінскі раён).

Больш сярод майстроў-разьбяроў мастацкай апрацоўкі дрэва, творцаў, якія займаюцца драўлянай скульптурай, малымі формамі і элементамі дамашняй аздобы, з-пад іх "залатых" рук атрымліваюцца сапраўдныя шэдэўры, якія вабяць вока і душу чалавека. Гэта — Ю. І. Камандзірчык з Нарачы Мядзельскага раёна; І. П. Супрунчык, А. С. Туркоў, У. М. Чыквін з Брэстчыны; Ф. Л. Максімаў з Віцебска; В. П. Казлоўскі, М. М. Ляшкоў, В. Л. Мінкоў, В. Р. Сілкоў з Гомельшчыны; М. А. Рышкевіч з Лідскага раёна; І. Л. Грышын і М. Ф. Ячмянькоў з Магілёўшчыны.

Адроджаная беларуская выцінанка цяпер атрымала новае жыццё, узнялася на вышэйшую ступень мастацкага развіцця. Сярод народных майстроў у традыцыйным стылі працуе Н. Р. Адзінец з вёскі Рэчань Любанскага раёна, выцінаншчыкі новага пакалення ствараюць складанасюжэтныя ўзоры станковага характару: В. В. Бабурына, Л. М. Валковіч-Борыс, Н. А. Сухая, Л. Л. Чырвонцава, А. І. Шаліма з Міншчыны; Н. М. Кулецкая з Івацэвіцкага і Ю. В. Каўрус з Нараўлянскага раёнаў, А. Ф. Аўчыннікаў з Гродна.

Найбольшым у новым выданні атрымаўся раздзел "Мастацкі тэкстыль", які адлюстроўвае майстроў ткацтва, вышыўкі, карункапляцення... Гэта і зразумела — доўгі час яшчэ пасля Вялікай Айчыннай вайны кросны знаходзіліся амаль у кожнай сялянскай хаце, а дзяўчаты без дабротных вышывак не маглі дастойна ісці да ўласнага вяселля. Заслугоўваюць асобнай увагі тыя майстрыхі кроснаў, якія адрадзілі, працягнулі забытыя ці занепалыя тыпы мясцовых традыцый: М. М. Астапеня, Н. Я. Гарашчэня, В. К. Гладкая, В. М. Кіеня, З. І. Кравец (закладное ткацтва на Капыльшчыне); В. І. Белакоз з Мастоўскага раёна і Н. А. Грыцук, М. І. Краўчынская з Камянецкага (ткацтва падвойных дываноў); М. Л. Гушча і Т. У. Міснікава з Гарадоцкага раёна (ажурнае ткацтва) і іншыя. Паспяхова развіваюцца і традыцыі ткацтва паясоў: Г. Р. Бураўцова (Старыя Дарогі), Т. М. Зданевіч (Бяроза), Х. С. Лямбовіч (Ракаў), Л. М. Лямцава (Круглае), Г. М. Сцепанюк (Антопаль), А. А. Хоміч (Нясвіжчына).

Заканчваецца выданне раздзелам пад умоўнай назвай "Рэдкія рамёствы". Сюды ўвайшлі народныя майстры роспісу па шкле (М. М. Кулецкая з Пружанаў), малявання дываноў (С. А. Скавырка з Глыбокага), мастацкай апрацоўкі скуры (І. В. Яўсціхаў з Віцебска), аздаблення велікодных вербаў ("пальмаў") (Д. Д. Кавалёнак з Гродна), вырабу музычных інструментаў (М. А. Скрамблевіч з Гродна), валяння з воўны (Т. М. Чараповіч з Дрыбіна), дэкаравання велікодных яек у тэхніцы шкрабанка (М. У. Вакульчык з Любаншчыны), вырабу вясельных вянкоў (Р. М. Валькова таксама з Любанскага раёна), аздаблення вясельных караваяў і іншай фігуратыўнай пластыкі з цеста (В. К. Уласік са Стоўбцаў).

Зборнік "Народныя майстры Беларусі" не атрымаўся б без творчых біяграфій, што падрыхтавалі метадысты абласных і іншых цэнтраў народнай творчасці, і ўступных артыкулаў прафесара Я. М. Сахуты, старшыні экспертнай камісіі па народных мастацкіх рамёствах. Адно засмучае, што вельмі цікавае і патрэбнае выданне адразу трапляе ў шэраг бібліяграфічных рэдкасцяў, бо выпушчана мізэрным накладам — 150 экземпляраў.

Алесь ЛОЗКА,
начальнік аддзела народнай творчасці Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур

Зірнуць па-новаму на незабыўнае

На пачатку лютага адбылася анлайн-прэзентацыя “Digitalmeetup”, на якой былі прадстаўленыя новыя лічбавыя праекты, прысвечаныя гісторыі Другой сусветнай вайны і асэнсаванню падзей у гады нацысцкай акупацыі. Іх каманды-стваральнікі зрабіліся пераможцамі конкурсу, што адбыўся мінулай восенню падчас форуму распрацоўшчыкаў “Hack4history”. Гэтае спаборніцтва ўжо двойчы прайшло ў рамках праекта “Мультыперспектыўнасць у гісторыі”, які ладзіцца пры ўдзеле Гістарычнай майстэрні імя Леаніда Левіна, Фонду развіцця Брэсцкай крэпасці і шэрагу арганізацый з Германіі, Польшчы і Расіі, што займаюцца пытаннямі культуры памяці. Мэта праекта -- аб’яднаць высілкі гісторыкаў, праграмістаў і журналістаў для стварэння лічбавых праектаў, прысвечаных гісторыі Другой сусветнай.

Антон РУДАК

На здымках:
1, 3 Сайт DOC–цэнтра “Тапаграфія памяці”.
2, 4 Старонкі мабільнага гіда па тэрыторыі лагера ваеннапалонных у Масюкоўшчыне.

Азнаёміцца з лічбавымі гістарычнымі праектамі можна на платформе Digitalhistorynetwork на сеціўным адрасе About-history.info. Намеснік дырэктара Фонду развіцця Брэсцкай крэпасці Аліна Дзеравянка распавяла, што ідэя праекта платформы ўзнікла ў 2018 годзе ў Мінску на міжнароднай сустрэчы з нагоды адкрыцця другой чаргі мемарыяла ў памяць аб ахвярах лагера смерці ў Малым Трасцянцы, дзе абмяркоўваліся новыя практыкі работы з культурай памяці. Гісторыкі не заўжды ведаюць, як у даступнай форме можна прадставіць тыя веды, якімі яны валодаюць, як найлепш данесці іх да аўдыторыі ў дзіджытал-фармаце, і менавіта платформа Digitalhistorynetwork была заклікана дапамагчы ім у прэзентацыі сваіх даследаванняў.

Гэтая пляцоўка створаная, каб аб’яднаць намаганні арганізацый, ініцыятыў і праектаў, якія працуюць у накірунку лічбавай гісторыі, выкарыстоўваючы электронныя медыя для аналізу, візуалізацыі і прэзентацыі гістарычных падзей. Сёння на платформе можна знайсці звесткі пра сорак чатыры арганізацыі з шасці краін, і праекты, якія імі рэалізуюцца, а таксама ўсе магчымыя аналітычныя тэксты, прысвечаныя пытанням культуры памяці. Тут таксама прадстаўленыя і пераможцы конкурсу, аб якіх пойдзе гаворка ніжэй.

ТАПАГРАФІЯ ПАМЯЦІ

Першы сярод прэзентаваных праектаў з Беларусі -- DOC–цэнтр ”Тапаграфія памяці”, пошукавая платформа аб забытых ахвярах Другой сусветнай вайны на тэрыторыі Гомельскай вобласці. Аб асаблівасцях праекта распавёў прадстаўнік яго каманды Уладзімір Александронец. Гэты інфармацыйна-адукацыйны рэсурс створаны для ўвекавечання памяці мірных жыхароў Гомельшчыны, пацярпелых ад нацысцкіх рэпрэсій у гады Вялікай Айчыннай вайны. На сеціўнай старонцы праекта па адрасе Docmemory.by прадстаўленыя некалькі тэматычных раздзелаў.

Старонка “Тапаграфія” ўяўляе з сябе інтэрактыўную карту з пазначанымі сямнаццаццю раённымі цэнтрамі колішняй Палескай вобласці, якая існавала з 1938 па 1954 год на тэрыторыі часткі сучаснай Гомельскай вобласці Беларусі. Старонкі аб кожным з гарадоў змяшчаюць звесткі аб гісторыі горада падчас Вялікай Айчыннай вайны і спадарожнікавую карту мясцовасці, на якой пазначаюцца месцы масавага знішчэння мірнага жыхарства.

У блоку “Голас памяці” прадстаўленыя аўдыё- і відэаматэрыялы вуснай гісторыі -- успаміны сведкаў ваеннага часу, якія жылі на акупаванай тэрыторыі, былі зняволеныя ў нацысцкіх лагерах, зрабіліся ахвярамі рэпрэсій акупантаў. Блок фотаматэрыялаў падзяляецца на здымкі даваеннага часу, партрэты ўдзельнікаў альбо відавочцаў падзей вайны і фота з месцаў памяці.

Раздзел “Архівы” змяшчае дакументы з дзяржаўных архіўных устаноў, такія як акты Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па расследаванні злачынстваў захопнікаў, альбо пайменныя спісы грамадзян, якія былі ўтаныя на прымусовую працу ў Германію ці забітыя. Таксама тут можна знайсці адпаведныя матэрыялы з фондаў музеяў і прыватных архіваў.

У раздзеле “Публіцыстыка” можна азнаёміцца з журналісцкімі тэкстамі, прысвечанымі падзеям і лёсам людзей падчас вайны, а на старонцы спецпраектаў -- з матэрыяламі, што з’явіліся ў выніку міжнароднага праекта “Новы погляд на гісторыю”, які дазваляе разгледзець гісторыю вайны праз лісты відавочцаў падзей, жыхароў спаленых вёсак, ваеннапалонных і ахвяр Халакосту. Асобныя раздзелы змяшчаюць таксама рэкамендацыі для педагогаў і даследчыкаў па правядзенні экспедыцый і збору звестак. Таксама на сайце прадстаўленыя матэрыялы арт-праектаў і выставак на ваенную тэматыку.

Асобная старонка адведзеная электроннай базе памяці, якая ўтрымлівае структураваныя звесткі аб людзях, якія былі прымусова вывезеныя ў Германію альбо загінулі падчас вайны. База таксама дае магчымасць пошуку па такіх крытэрыях, як нацыянальнасць ахвяр, іх год нараджэння, пол, род заняткаў, месца жыхарства. Платформа дазваляе любому карыстальніку прапанаваць свае матэрыялы па тэме, якія могуць быць размешчаныя на сайце пасля мадэрацыі.

Таксама з пачатку года каманда праекта ў супрацоўніцтве з галоўным упраўленнем па адукацыі Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта распачала рэгіянальную пошукавую экспедыцыю “Тапаграфія памяці”, што дазволіць сабраць новыя матэрыялы па тэматыцы сайта. У рамках праекта маюць адбыцца сумесныя мерапрыемствы з установамі адукацыі і культуры ў раённых цэнтрах вобласці і адукацыйныя майстар-класы.

ГІСТОРЫЯ МЕСЦА — ПРАЗ ЛЁС ЧАЛАВЕКА

Наступны праект рэалізуецца камандай “Зберажом Масюкоўшчыну”. Гэтая валанцёрская ініцыятыва ставіць сваёй мэтай захаванне тэрыторыі колішняга лагера ваеннапалонных пад назвай Шталаг 352 на ўскраіне Мінска, якой часткова пагражала новая гарадская забудова. Захапіўшы Мінск 28 чэрвеня 1941 года, акупанты неўзабаве стварылі так званы Stammlager -- “асноўны лагер”, адно з аддзяленняў якога размяшчалася ў вайсковым гарадку ля вёскі Масюкоўшчына, збудаваным напрыканцы 1930-х гадоў для патрэб Чырвонай арміі. Менавіта сюды 17 ліпеня 1941 года былі пераведзеныя 47 тысяч савецкіх салдат і афіцэраў, захопленых у палон у ваколіцах горада. Сёння плануецца захаваць даваенны будынак казармы па вуліцы Лынькова, 111 Г, дзе знаходзіўся лагерны лазарэт, а таксама будынкі колішніх сталовай, майстэрні і сховішча для гародніны.

Як распавяла ўдзельніца каманды Святлана Бень, вынікам праекта мае быць электронны праваднік па тэрыторыі лагера, адаптаваны для прагляду на мабільных прыладах, у аснову якога пакладзеная асабістая гісторыя аднаго з ваеннапалонных -- Міхаіла Сенькіна. Колішні ваенны фельчар, ён быў застрэлены, калі спрабаваў аказаць дапамогу аднаму з вязняў лагера. Ваеннапалонныя былі абураныя гэтым выпадкам і ў лагеры ўзнікла пагроза паўстання. У выніку, у адрозненне ад іншых вязняў, целы якіх хавалі ў агульных магілах без усякіх пазнак, Міхаіла Сенькіна было дазволена пахаваць у труне, пад гукі аркестра і ў асобнай магіле. Праваднік распавядае праз гэты эпізод аб усёй гісторыі лагера і прызначэнні яго пабудоў, прапаноўваючы карыстальніку самастойна разблытаць гэты сюжэт як дэтэктыўную гісторыю.

Тут змешчаныя расповеды аб працы і лячэнні вязняў у лагерным лазарэце, умовах утрымання ў бараках, якія суправаджаюцца мноствам архіўных здымкаў, зробленых нямецкімі салдатамі на тэрыторыі шталага. Таксама можна пабачыць 3D-мадэлі артэфактаў, адшуканых на месцы лагера ў рамках пошукавых археалагічных работ, напрыклад -- здымкі знойдзеных у адным з баракаў драўляных бэлек з запісамі, якія былі пакінутыя вязнямі.

Магчыма праслухаць і аўдыёфайлы з начытанымі ўспамінамі ваеннапалонных і дакументамі, якія сведчаць аб побыце вязняў. Асобныя старонкі праваднікa распавядаюць аб месцах масавых пахаванняў ваеннапалонных, памерлых у лагеры ад невыносных умоваў утрымання альбо забітых аховай, тут знаходзяцца і аэрафотаздымкі тэрыторыі лагера і яго ваколіц, выявы салдацкіх медальёнаў, знойдзеных у агульных магілах.

Вядома, значнае месца ў гісторыі лагера адведзена і падпольнай барацьбе і супраціву яго ахвяр. Частка аповеду пабудавана на фрагментах з аповесці “Зніклы без звестак”, напісанай Сцяпанам Злобіным -- колішнім вязнем лагера, які працаваў санітарам у тамтэйшым лазарэце. Таксама ў праваднікy паказваецца пасляваенная гісторыя гэтых мясцін, распавядаецца аб сённяшняй дзейнасці па захаванні лагера, аб пошукавай працы і перапахаванні парэштак вязняў, росшуку іх сваякоў. Работа над мабільным гідам мусіць быць завершаная неўзабаве.

САЮЗ ДЗЕЛЯ ВЫРАТАВАННЯ

Апошнім прэзентаваным беларускім праектам быў фотаархіў, прысвечаны вяселлям, якія адбыліся падчас вайны, падрыхтаваны камандай “VEHA”. Праект скіраваны на работу з сямейнымі архівамі і паказ гісторыі паўсядзённасці праз старыя фотаздымкі, а таксама на патрэбу больш пільна ставіцца да сямейных гісторый, з якіх складаецца мінулае ўсёй супольнасці. Як адзначыла прадстаўніца праекта Леся Пчолка, сёння традыцыя вяселля трансфармавалася ў бок успрымання гэтага дня як найшчаслівейшага ў жыцці, але трэба ўлічваць, што такі погляд усталяваўся адносна нядаўна, а ў традыцыйнай беларускай культуры вяселле трактавалася больш неадназначна.

Вынікам росшукаў у сямейных архівах беларусаў зрабіліся падрыхтаваныя праектам кнігі “Апошні здымак” і “Дзявочы вечар”, якія маюць выйсці ў сакавіку. Абраныя тэмы падкрэсліваюць, што ў многіх выпадках раней на памяць аб чалавеку захоўваліся толькі два здымкі -- з вяселля і пахавання. Таму было вырашана больш дэтальна прасачыць тэму вяселляў ваеннага часу, якая ў тым ліку была звязаная з каханнем і смерцю.

Падчас вайны людзі часта рызыкавалі жыццём і гінулі з той прычыны, што іх звязваў шлюб -- у выпадку з удзелам у падполлі ці партызанцы, альбо ў мяшаных шлюбах яўрэяў з прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцяў. Таксама вяселле магло зрабіцца спосабам выжыць, калі людзі браліся шлюбам, каб пазбегнуць вывазу на прымусовую працу ў Германію, альбо каб не быць прызванымі на службу ў паліцыю. Прэзентацыя праекта мае адбыцца 20 лютага ў відэафармаце на старонках каманды ў сацыяльных сетках.

Рэха падзей апошняй вайны ўсё часцей знаходзіць выяўленне ў праектах, арыентаваных на ўвекавечанне канкрэтных месцаў памяці і асабістых гісторый герояў ды ахвяр. Менавіта такі падыход не дазваляе памяці аб тых трагічных днях зрабіцца фармальнай і забяспечвае жывую сувязь пакаленняў. Навакольныя краявіды і сямейныя архівы хаваюць яшчэ багата таямніц, а значыць, варта чакаць новых праектаў і ініцыятыў, якія дапамогуць захаваць сведчанні аб гераічных і трагічных старонках нашай мінуўшчыны.

К

18 лютага споўнілася б 99 гадоў з дня нараджэння народнага мастака БССР і СССР, Героя Беларусі Міхаіла Андрэевіча Савіцкага. На першы погляд, дата не для афіцыйнага адзначэння, не юбілейная. Але мне здаецца, што лічба "дзевяноста дзевяць" — нейкім містычным чынам — штосьці азначае, нават цяпер, калі мастака няма з намі ўжо больш за дзесяць гадоў. Калі верыць так званай ангельскай нумералогіі, дык гэта моцны лік, які сімвалізуе самадысцыпліну і незалежнасць характару, гуманізм і духоўную прасветленасць, цярпімасць і імкненне да лідарства. Бадай усімі гэтымі якасцямі і валодаў Творца.
І зусім заканамерна, што нядаўна сталіца ўвекавечыла яго імя ў гарадской прасторы: рашэннем Мінгарсавета дэпутатаў ад 24 снежня 2020 года за № 259 на тэрыторыі шматфункцыянальнага комплексу "Минск Мир" з'явілася вуліца Міхаіла Савіцкага (побач з вуліцамі архітэктара Леаніда Левіна і кампазітара Ігара Лучанка).

Міхаіл Савіцкі. Чэрвень 1941 года.

"Раней тут уставала зямля на дыбкі..."

Апошні бой Міхаіла Савіцкага

У час маіх шматгадовых сустрэч з Міхаілам Андрэевічам і "кіламетрамі" запісаў яго ўспамінаў, а таксама знаёмства з рэдкімі архіўнымі дакументамі ваенных гадоў, кінахронікай, пажоўклымі фатаграфіямі, лістамі франтавікоў, я сутыкнуўся з тым эксклюзівам, пра які раней амаль мала хто ведаў. Я маю на ўвазе тое, як 19-гадовы хлопец з Беларусі, у будучым - сусветна вядомы мастак, стаў удзельнікам гераічнай Севастопальскай эпапеі, пачынаючы з восені 1941-га, і фактычна — адным з апошніх абаронцаў гэтай чарнаморскай цвярдыні. Ён абараняў Севастопаль на самым краёчку мыса Херсанес — ля легендарнага Херсанескага маяка — апошняга апірышча абаронцаў горада, калі амаль нікога з байцоў ужо не заставалася ў жывых... Абараняў да самага падзення Севастопаля, гэта значыць да 4 ліпеня 1942-га — практычна да таго часу, калі яго родная 345-я стралковая дывізія, паспеўшы ўтапіць свае баявыя сцягі ў Чорным моры, была поўнасцю знішчана ворагам... І тады цяжка паранены чырвонаармеец Савіцкі разам з сотнямі іншых таварышаў па зброі, патрапіў у палон — доўгі, страшэнны, жудасны...

Пра фашысцкія канцлагеры смерці, у якіх Міхаіл Андрэевіч прабыў аж да красавіка 1945-га, чалавецтву добра вядома. Ды і яго серыя палотнаў "Лічбы на сэрцы" пра гэта — прагучала на ўвесь белы свет. А вось пра яго непасрэдны ўдзел у гераічнай абароне Севастопаля мы ведалі толькі па некалькіх сціплых радках яго біяграфіі...

...А ўсё пачыналася так цудоўна. Напрыканцы мая 1940-га сялянскі хлопец з вёскі Звянячы Талачынскага раёна Міша Савіцкі атрымаў выдатны атэстат сталасці ў Талачынскай сярэдняй школе. Перад ім паўстала пытанне: што далей? Зразумела, звязаць сваё жыццё з мастацтвам. Але, таксама зразумела, спачатку трэба было адслужыць у Рабоча-сялянскай Чырвонай арміі.

Справа ў тым, што 1 верасня 1939 года Вярхоўны Савет СССР прыняў новы Закон аб усеагульным воінскім абавязку. Закон устанавіў новыя тэрміны службы для радавога і малодшага начальніцкага складу: у сухапутных войсках — да трох гадоў (замест аднаго), у авіяцыі — да чатырох (замест трох), на флоце — да пяці гадоў (замест чатырох). Прызыўны ўзрост зніжаўся з 21 года да 19, а для тых, хто скончыў поўную сярэднюю школу (як Савіцкі), — да 18 гадоў. Аднак у той час працяглыя тэрміны службы навабранцаў не палохалі: служыць у Чырвонай арміі лічылася справай гонару і гераійства. Ды і лісты старэйшых братоў — Аляксея, Івана і Уладзіміра, якія ўжо праходзілі ваенную службу, былі поўныя захаплення. Усё падабалася і Мішу, але галоўная патаемная мара — стаць мастаком — лунала ўсё ж на першым месцы. Зрэшты, часу для рэалізацыі такой мары, здавалася, у яго яшчэ было дастаткова. Праслужыць тры гады ў арміі і стаць па-сапраўднаму мужчынам — хіба гэта дрэнна?

14 верасня 1940-га Міхаіл атрымаў павестку — гэта быў выклік у Талачынскі ваенны камісарыят. Спехам, у адсутнасці родных, Міхаіл сабраў свой маленькі драўляны куфэрак, нацягнуў берэт, ватоўку-безрукаўку і на папутцы знік, знянацку для ўсіх, прыхапіўшы на дарожку "паўцаглінкі" чорнага хлеба ды мяшэчак любімых ледзянцоў. Пра сябе падумаў: у Талачын — і ўмомант назад. Ад Коханава да Талачына ўсяго ж кіламетраў дваццаць з нечым. Дазволіць жа ваенкам перад далёкай дарогай адлучыцца дадому на дзянёк-другі, каб па-чалавечы развітацца з сям'ёй.

Але такой магчымасці не прадставілася. Ваенкамат, размешчаны ў будынку былога праваслаўнага Пакроўскага манастыра, стаў для Міхаіла апошнім даваенным мірным "паўстанкам" на яго малой радзіме. У той жа дзень навабранцаў хутка пагрузілі ў эшалоны і — праз усю Украіну кудысьці на поўдзень...

Міхаіл Савіцкі. "Клятва севастопальцаў".

Ужо пасля вайны Міхаіл даведаўся, што вельмі шмат моладзі з роднай вёскі не вярнулася з вайны. І старэйшых братоў Савіцкіх таксама пазабірала праклятая вайна. Аляксей загінуў у 1942-м, праз год загінуў смерцю храбрых і Уладзімір. Іван выжыў, але вярнуўся з фронту інвалідам, жыў у Оршы, і там жа ў 1961-м памёр ад старых ран ва ўзросце 46 гадоў.

...Службу ў Чырвонай арміі Міхаіл пачаў у Наварасійску ў Курскім 545-м зенітна-артылерыйскім палку, чым вельмі ганарыўся. Ён шмат чытаў пра самую высокую па тых часах тэхнічную забяспечанасць гэтага роду войскаў. І кіно з захапленнем глядзеў пра гэта, асабліва стужку "Калі заўтра вайна". Цягам месяца ён прайшоў курс маладога байца і прыняў прысягу. Праз нейкі час яго перакінулі ў Растоў-на-Доне — у школу малодшых камандзіраў па кіраванні зенітнай артылерыяй. Але скончыць яе не паспеў: Міхаіла нечакана перавялі ў горад Грозны і прызначылі на пасаду памочніка старшыні палігона авіяцыйнага вучылішча.

Міхаіл Савіцкі ўспамінаў: "...Дзень абвяшчэння вайны не выклікаў ні страху, ні разгубленасці. Усе мы верылі, што знішчым ворага праз пару тыдняў на ягонай жа тэрыторыі. У той час прызначылі мяне камандзірам падраздзялення, якое суправаджала навабранцаў з Грознага ў раён Кахоўкі. Даставілі мы гэты эшалон, і адразу давялося дабірацца ў Растоў-на-Доне. Адтуль — у Махачкалу, потым — у Севастопаль. У дарозе мне трапілася ў рукі газета "Правда" за 24 чэрвеня. І там, на чацвёртай паласе, прачытаў верш Якуба Коласа "Шалёнага пса — на ланцуг!" Вось малайчына мой зямляк, падумаў я. З такой верай у перамогу абавязкова зламаем хрыбет Гітлеру! Па прыбыцці ў Севастопаль мы адразу ўступілі ў бой. Спачатку выбілі ворага з ускраіны горада — з так званых Італьянскіх могілак — і занялі вузлавую ды пасажырскую станцыю пад назвай Мекензіевы Горы. Гэтая станцыя была размешчана на ўчастку паміж Сімферопалем і Севастопалем, дакладней, кіламетраў за пятнаццаць ад апошняга. А самі невысокія, пакрытыя нізкарослым лесам Мекензіевы горы цягнуліся на некалькі кіламетраў уздоўж ракі Бельбек.

Фрагменты ліста М. Савіцкаму ад Г. Калугінай.

Дык вось, палажэнне на гэтым участку фронту склалася вельмі цяжкае. Крапасных збудаванняў мала, батарэі працавалі на абарону толькі з мора, а фашысты пасля ўзяцця Керчы кінулі на Севастопаль усе сілы, што былі сканцэнтраваны ў Крыме, у тым ліку — авіяцыю і моцную артылерыю. Калі ў маі — чэрвені 1942-га мы выбівалі ворага з гэтых могілак, я ў складзе маленькай групы забяспечваў пасыльную сувязь паміж штабамі 345-й дывізіі і 25-й Чапаеўскай дывізіі, што знаходзілася на Манастыргары. Даводзілася кругласутачна курсіраваць праз забалочаную пойму Чорнай ракі. З кожным днём станавілася ўсё цяжэй. Не хапала боепрыпасаў. Калі немцы прарваліся ў горад, амаль тысяча салдат адышла на ўкраіну Херсанеса. Мы замацаваліся на ўзбярэжжы ў камянях ля маяка і пратрымаліся яшчэ чацвёра сутак. Кожны патрон быў на ўліку. Білі толькі прыцэльна. На пятыя суткі патроны скончыліся. Дзявацца нам не было куды..."

Хачу прывесці фрагмент ліста Мікалая Тараненкі, напісанага "дарагому аднапалчаніну Мішу Савіцкаму" 22 сакавіка 1987 года з горада Обнінска Краснадарскага краю. Яны служылі ў адной часці і менавіта былі побач у апошнім баі ля Херсанескага маяка. "...Калі немец цясніў нас з Мекензіевых гор і аўтаматчыкі абстрэльвалі бухту, я літаральна са шпіталя трапіў у ваш 793-ці батальён сувязі. Памятаеш? Штаб дывізіі тады знаходзіўся на паўночным баку бухты ў штольні бензасховішча. Потым мы адкінулі ворага і выраўнялі пазіцыі. А калі пакідалі Інкерман, уначы, пры газоўцы, проста ў пуні, дзе мы размяшчаліся, нам абвясцілі, што немец абышоў нас на гары і адрэзаў ад Севастопаля. Незадоўга да гэтага мне з чатырма маракамі давялося выратоўваць Севастопальскую панараму. Ну, і потым на Херсанескім маяку 4 ліпеня 1942 года раздзяліў з табой журботны лёс: трапіў у палон. Таксама паранены. Тады ніхто з нас дабраахвотна не здаўся б на літасць ворагу... У Расію, як і ты, вярнуўся ў 1945-м. Служыў у Смаленску, дэмабілізаваўся праз год. Але вось узнагароды за абарону Севастопаля, як і тысячы іншых яго абаронцаў, не маю..." Дарэчы, Міхаіл Савіцкі сваю першую ўзнагароду — медаль "За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг." атрымаў толькі ў 1957 годзе...

Барыс КРЭПАК

Працяг — у наступных нумарах "К".

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 397 01 63 (экскурсійнае бюро)
Пастаянныя экспазіцыі:
■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст."; "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст."; "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст."; "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст."; "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст."; "Мастацтва краін Усходу XIV — XX стст.".
Выставы:
■ Выстава **"Лёс мастака"** (да 125-годдзя Міхася Філіповіча) — да 4 красавіка.
■ Выстава твораў жывапісу, графікі Алега Прусава **"Надпіс на адвароце"**.
■ Выстава жывапісу Паўла Хадаровіча **"Мова рэчаў"** — да 28 лютага.
■ Выставачны праект **"Давід Якерсон. Скульптура. Графіка"** — да 4 красавіка.
■ Выстава графікі і акварэляў Леаніда Марчанкі **"Летапіс маіх дарог"** — да 21 сакавіка.
■ Выстава **"Ліза Саціліс — Джорджа дэ Кірыка. Скульптура, графіка"**.
■ **"Фердынанд Рушчыц"**: віртуальная выстава да 150-годдзя з дня нараджэння.
■ Віртуальная выстава твораў Віталя Чарнабрысава **"Вангогісты Гаген"**.

Філіялы музея
МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І ПАЛОВЫ XIX СТ."
г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а.
Тэл.: 358 88 78
■ Калядная праграма **"У гасцях у казкі"**. Пачатак а 17-й.
Пастаянныя экспазіцыі:
■ **"Інтэр'еры шляхецкай сядзібы"**.
■ **"Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча"**.
■ **"Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст."**.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ
Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Повязь часоў"**, якая знаёміць з багаццем вобразаў традыцыйнага ручніка.
■ **Займальныя майстар-класы** па саломапляценню, вырабу традыцыйных лялек, пляценні паясоў (бранзалетаў). Патрапіць на майстар-клас можна ў любы працоўны дзень музея: серада-нядзеля з 10.00 да 17.00. Папярэдні запіс абавязковы.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЦЭНТР СУЧАСНЫХ МАСТАЦТВАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск,вул. Някрасава, 3
Тэл.: 399-09-79
Час працы: серада-нядзеля цз 12:00 да 20:00
■ Інтэрактыўны выставачны праект **"PRO-котов"**.
■ Калектыўная мастацкая выстава **"Сучасны беларускі пейзаж"**.
■ Выставачны праект **"Альтэрнатыва"**.
■ Выстава **"У пошуках лепшага"**.
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 47
Тэл.: 242-78-14
Час працы: аўторак-нядзеля 12.00-20.00
■ Выстава **"Лінія любові. Эратызм у творчасці вялікіх майстроў XX стагоддзя"**.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ
г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.
Тэл. +375 (17) 203 07 92, +375 (29) 144 07 92, +375 (17) 327 11 66. Музей працуе: аўторак, серада, пятніца, субота, нядзеля — з 10.00 да 18.00 (касы да 17.30), чацвер — з 12.00 да 20.00 (касы да 19.30) панядзелак — выхадны.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Часовая экспазіцыя **"Забыццю не падлягае"**, прымеркаваная да 75-годдзя Мінскага судовага працэсу — да 23 лютага.
■ Часовая экспазіцыя **"Мастак і час"**, прымеркаваная да 90-годдзя з дня нараджэння Георгія Паплаўскага — да 12 сакавіка.
■ Фотадакументальная часовая экспазіцыя **"Армія, народжаная Кастрычнікам"**, прысвечаная Дню абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь — з 23 лютага да 21 сакавіка.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"
г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02; +37529 551 80 51, + 37529 190 31 49.
Палацавы ансамбль
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выставачны праект **"Сапраўднае"** мастакоў міжнароднага грамадскага аб'яднання "Еўразійская мастацкая садружнасць" — да 27 лютага.
■ Выставачны праект **"Пасядзім з густам!"** (фатэлі і крэслы XVIII — XX стст. з фондаў музея-запаведніка) + квэст-віктарына **"Пасядзім, падумаем"**. Па папярэдніх заяўках. Да 5 красавіка.
■ Міжнародны выставачны праект **"Castrum doloris. Пахавальны цырыманіял нясвіжскага двара"**. У складзе пастаяннай экспазіцыі.
■ Міжнародны выставачны праект **"Даспехі радзівілаўскага Нясвіжа"** (артэфакты з калекцый Музея Фіцвільяма Кэмбрыджскага універсітэта, Нацыянальнага гістарычнага музея і Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка "Нясвіж"). У складзе пастаяннай экспазіцыі.
Сектар экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці
Вул. Гейсіка, 1.
■ Выстава работ Святланы Курашовай **"Акварэль. Курашова і Курашова"** — да 28 лютага.
Ратуша
г. Нясвіж, вул. Савецкая, 3.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Квэст **"Выходкі старога захавальніка"**. Па папярэдніх заяўках.

ПА ПЫТАННЯХ РАЗМЯШЧЭННЯ РЭКЛАМЫ Ў ГАЗЕЦЕ "КУЛЬТУРА"
звяртайцеся па тэлефоне
+ 375 17 286 07 97
і па тэлефоне/факсе
+375 17 334 57 41
альбо пішыце на электронны адрас
kultura@tut.by!

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"
г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 90, (8–01596) 2 82 70.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Тэатралізаваная экскурсія **"Мірскі замак і яго ўладальнікі: шлях праз стагоддзі"**.
■ Экскурсія з элементамі дэгустацыі **"У госці да Пане Каханку"**.
■ Экскурсія з элементамі анімацыі і дэгустацыі **"Мірскі замак. Гісторыя. Культура. Дэгустацыя"**.
■ Тэматычная экскурсія з элементамі квэста для дваіх **"Інтрыгі Купідона"**.
■ Музейныя камунікатыўныя праграмы: **"Табе, нашчадак, у добры дар..."**, **"Ад усяго сэрца — самы лепшы пачастунак"**, **"Капрызы моды ракако"**.
■ Дзіцячая тэатралізаваная экскурсія **"Чароўная гісторыя ў Мірскім замку"**.
■ Правядзенне вясельных цырымоній, святкаванне гадавіны вяселля.
■ Музейная фотапляцоўка.
■ **Квэст "Таямніца двух куфраў"**.

У МІНСКУ ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" МОЖНА НАБЫЦЬ У НАСТУПНЫХ КРОПКАХ:

магазіны "Белсаюздрук"	кіёскі "Белсаюздрук"
Падземны пераход ст.м. "Пятроўшчына".	ст.м. "Няміга", вул. М. Багдановіча.
Падземны пераход ст.м. "Плошча Перамогі".	Праспект Пераможцаў, 5.
	Вуліца Рабкораўская, 17.
Праспект Незалежнасці, 44.	Праспект Незалежнасці, 68, В.
Вуліца Валадарскага, 16.	Вуліца Лабанка, 2.

Фрагмент выставы "Надпіс на адвароце".

Надпіс на адвароце карціны

(Заканчэнне. Пачатак на старонках 8 — 9)

Алег Прусаў пражыў толькі 26 гадоў. У 1990 скончыў Мінскую мастацкую вучэльню — "Глебаўку". З 1990-га па 1993-ці вучыўся ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. За сваё кароткае жыццё зрабіў недзе дзве сотні жывапісных карцін і графічных аркушаў, выдаў два зборнікі вершаў. Ягоныя творы экспанаваліся на радзіме, а таксама ў Маскве і Галандыі. Работы мастака захоўваюцца ў прыватных калекцыях Беларусі, Расіі, Даніі, Швецыі, Германіі, Галандыі. Драматызм ягонаму жыццю і творчасці надае тая акалічнасць, што мастак меў сур'ёзныя праблемы са зрокам. Можна сказаць, што вочы ягоныя закрыліся яшчэ пры жыцці. Можна ўявіць, якіх высілкаў каштавала яму творчая праца, а працаваў ён да апошніх дзён.

Алег Прусаў быў з тых, каго называюць "self-mademan" — той, хто зрабіў сябе сам. Той, хто стаў тым, кім хацеў стаць, насуперак усім акалічнасцям лёсу. Ён не стаяў у чарзе на дзяржаўную ці якую карпаратыўную замову. Спадзяваўся толькі на сябе і свой талент.

Сюжэты, тэматыка твораў Алега Прусава ў агульных рысах супадаюць з тым, што рабілі многія іншыя мастакі. Зрэшты, наш свет нязменны ўжо не адно стагоддзе, а сэнс творчасці ў тым, каб сказаць пра звыклае нязвыклымі словамі. У Алега Прусава гэта атрымлівалася. Кажуць, што жыццё — не біяграфія. А датычная мастака біяграфія часта не болей чым надпіс на адвароце карціны...

К

Алег Прусаў. "П'яніца. Цынік".

Алег Прусаў. "Крэсла імператара".

ТЭАТРЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1. Тэл./факс: 334 11 56.
■ **20 — "Кошчын дом"** (опера ў 2-х дзеях) П.Вальдгардта. Дырыжор — Дзмітрый Мацвіенка. Пачатак а 12-й.
■ **20 — "Мадам Батэрфляй"** (опера ў 3-х дзеях) Дж.Пучыні. Дырыжор — Алег Лясун.
■ **21 — "Чароўная флейта"** (опера ў 2-х дзеях). Дырыжор — Іван Касцяхін. Пачатак а 18-й.
■ **23 — "Вельмі страшны канцэрт"** (спецпраект Алены Медзяковай). Камерная зала імя Л.П.Александроўскай. Пачатак у 19.30.
■ **24 — "Эсмеральда"** (рамантычны балет у 3-х дзеях) Ц.Пуні. Дырыжор — Мікалай Калядка.
■ **25 — "Пікавая дама"** (опера ў 2-х дзеях) П.Чайкоўскага. Дырыжор — Іван Касцяхін.
■ **26, 27 — "Рамэа і Джульета"** (балет у 3-х дзеях) С.Пракоф'ева. Дырыжор — Уладзімір Авадок.
■ **27 — Канцэрт "Вышэй за неба"** (музыка эпохі барока з удзелам вядучых салістаў оперы і трыа "Глорыя"). Камерная зала імя Л.П.Александроўскай. Пачатак у 19.30.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"
г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44. Тэл./факс: 154 04 44.
■ **20, 25 — "Сірожа"** (жыццё ў дзвюх эпохах) Ю.Чарняўскай.
■ **22 — "Вар'ятка"** (трагіфарс у 2-х дзеях) Н.Птушкінай.
■ **23 — "Адамавы жарты"** (камедыя) С.Навуменка.
■ **24 — "Чарнобыльская малітва"** С.Алексіевіч (сумесны франка-беларускі праект).
■ **26 — "Мудрамер"** (сатырычная камедыя) М.Матукоўскага.
■ **27 — "Шлюб з ветрам"** (песня ў адной дзеі) Я.Карняга. К.Аверкавай.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"
г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2. Тэл.: (8-0212) 36 32 50.
■ **20 — "Цудоўная скрыня з зялёным гарошкам"** (казачная гісторыя па матывах шведскіх казак у 2-х дзеях).
■ **21 — "Марозка"** (казка на 2 дзеі) М.Шурынава.
■ **27 — "Ох і залатая табакерка"** (спектакль-імправізацыя) Л.Сіманёнак. Прэм'ера. Пачатак спектакляў аб 11-й.

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ.

З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").